Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЖНІВЕНЬ 28 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 189 (4733)

Год выданьня XVII

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР ПА ЗЬМЕНАХ І СПРАШЧЭНЬНІ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Антыдзяржаўнай практыцы—сакрушальны адпор. У барацьбе за пралетарскі інтэрнацыяналізм.

Аб рабоце лёгкай прамысловасьці Беларусі—з выступленьня народнага камісара лёгкай прамысловасьці СССР тав. ЛЮБІМАВА на партнарадзе гаспадарнікаў лёгкай прамысловасьці БССР.

Сваячасова і высокакласна засеяць кожны гэктар азімых!

ЗА МЯЖОЙ.

Тэрор супроць рэвалюцыйнага руху.

Японска-манчжурскія войскі акупавалі Гуань.

Моладзь капіталістычных краін рыхтуецца да 19-га МЮД'у.

Прыезд Эрыё ў СССР.

АНТЫДЗЯРЖАЎНАЙ ПРАКТЫЦЫ—САКРУШАЛЬНЫ АДПОР

Наша краіна ўпэўненым крокам ідзе па шляху індустрыялізацыі. Перамога першай вясны другой пяцігодкі на вёсцы, дасканалыя ўзоры ўборкі ўраджаю і абмалоту, першыя перамогі паасобных абласьцей у выкананьні азімай сяўбы—усё гэта непарыўная, сустаўная частка перамог генэральнай лініі партыі ў справе індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

На калгасных і саўгасных палёх нашай зямлі ў гэтым годзе працуе каля 200.000 трактараў і 20.000 рухавікоў і лёкамабіляў, звыш 10.000 грузавых аўтамабіляў.

Краіна ўступіла ў самы напружаны і складаны пэрыяд сельска-гаспадарчых работ. Завяршэньне касавіцы, сьціртаваньне, абмалот, выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай, уборка прапашных і тэхнічных культур, азімая сяўба, уздым зяблівы—вось тыя вялікія задачы, якія цяпер пераплятаюцца адна з другой і патрабуюць неадкладнага выкананьня.

Роля пасылаемага і паслапага ў вёску машына-трактарнага парку ў пасляховым вырашэньні ўсіх задач, што стаяць перад сельскай гаспадаркай, вялізарная. Узяць гаця-б заданьне партыі і ўраду па зяблівым ворыве. Зяблева павінна быць узнята восьмёю 1933 году 36,5 мільёнаў га. Выкананьне гэтага зусім абавязковага і зусім пасільнага заданьня патрабуе, каб трактарны парк быў поўнасьцю і своячасова падрыхтован, каб усе трактары і прычэпны інвэнтар поўнасьцю і своячасова былі адрамантаваны і забясьпечаны запаснымі часткамі.

Партыя і ўрад патрабуюць ад усіх заводаў, ад усіх гаспадарчых кіраўнікоў, абавязаных снабжаць машына-трактарны парк сельскай гаспадаркі **запаснымі часткамі**, каб праграма іх вытворчасьці была выканана **поўнасьцю, у тэрмін і ў патрэбным комплексе па ўсіх дэталях.** Вось гэтага рашаючага патрабаваньня партыі і ўраду многія заводы і іх кіраўнікі ня выконваюць.

Шматлікія факты гавораць аб самай грубай недаацэнцы гэтай важнейшай народна-гаспадарчай задачы.

Так, напрыклад, **Арлоўскі завод імя Мядзьведзева** з месяца ў месяц выконвае праграму па запчастках толькі на 15-20 проц., хоць ёсьць поўная магчымасьць выконваць праграму поўнасьцю. Гэта ёсьць простае невыкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб **своячасовым і поўным** выкананьні заданьня па запчастках.

Мэханічны завод імя Энгельса — адзін з ліку тых 12 заводаў, якія нядаўна захацаваны за **«Ватозапчастыю»** і на якіх трэба сканцэнтраваць выраб запчастак для трактараў. Аднак, у вытворчай праграме заводу, расцвярджанай трэстам «Ватозапчасть», запчасткам не аказалася месца. У апошній прадукцыі заводу запчасткі займаюць усяго 5 проц.

Такія прыклады, на жаль, не выключэньне. Нават самыя перадавыя нашы прадпрыемствы, якімі мае права ганарыцца ўся краіна, дазваляюць сабе абсалютна недапушчальнае ігнараваньне заданьняў па запчастках. Так, напрыклад, Сталінградзкі трактарны ня выканаў у ліпені і ня выконвае таксама і ў жніўні праграмы па запчастках.

Горш за ўсё стаіць справа з **не камплектнасьцю.** На радзе прадпрыемстваў, вырабляючых запчасткі, моцна разьвіты тэндэнцыі: за агульным, часам даволі высокім, процантам выкананьня ўрадавых заданьняў **утаіць невыкананьні праграмы па самых адказных і самых вострадэфіцытных дэталях.** Так, па зводцы **гутал** на 11 жніўня заданьне па запчастках на 1933 г. выканана на 74,6 проц., **але за гэтай агульнай лічбай хаваюцца такія абсалютна недапушчальныя факты, як невыкананьне пляну па радзе самых вострадэфіцытных дэталях для трактараў «СТЗ» і «ХТЗ», а таксама замежных марак.** Сталінградзкі трактарны побач з невыкананьнем пляну па вострадэфіцытных дэталях сыстэматычна павялічвае свой доўг таксама па каленчатых валах.

Некамплектнасьці вырабу і адсылцы запасных частак трэба абвясьціць самую бязьлітасную барацьбу. Кіраўнікі заводаў павінны, нарэшце, зразумець, што трактар, як і іншыя сельска-гаспадарчыя машыны, ня можа працаваць ня толькі без такой буйной дэталі, як каленчаты вал, але і бяз любой гайкі і балта. Адсутнасьць гэтых дробных, малапрыметных дэталяй прыводзіць да такіх-жа вымушаных прастояў машына-трактарнага парку, як і адсутнасьць буйных дэталяй. Напляваўцельскія адносіны да дробных дэталяй, да пэрмачарговага выкананьня заказаў на вострадэфіцытныя дэталі ёсьць простае парушэньне законаў пралетарскай дзяржавы.

Нядаўна закончаны суд па справе аб некамплектнай адгрузцы камбайнаў заводам «Камунар» павінен перасьцярэгчы кіраўнікоў нашых заводаў ад падобнай антыдзяржаўнай практыкі. Але, да слова сказаць, пры ходзіцца адзначыць, што кіраўнікоў заводу і партыйную арганізацыю Ростсельмашу ні пастанова ўраду, ні прыгавор суда нічаму не навучылі. Нават пасьля прыгавору Вярхоўнага Суда Саюзу па справе «Камунара» 23 жніўня Ростсельмаш **праводзіў далей адгрузку ўборачных машын, а таксама нядобракасных дэталяй.**

Ня ўсё стаіць добра таксама і з **дастаўкаю запасных частак на месцы.** Мала вырабіць запчасткі ў тэрмін і ў патрэбнай колькасьці і камплексе, неабходна таксама, каб гэтыя запчасткі былі дастаўлены своячасова машына-трактарным станцыям і саўгасам на месцы, каб гэтыя запчасткі не асядалі ў каналах розных снабжаючых арганізацый. Факты, аднак, паказваюць, што такое асяданьне мае месца. Вось, напрыклад, узяць хаця-б **Чарнігаўскую базу «Снабрэмонта».** Аказваецца, на складах гэтай базы... «затаварваньне запчастак»—на цэлых 126.000 руб. І гэта ў той самы час, калі МТС і саўгасы Чарнігаўшчыны адчуваюць вострую патрэбу ў запчастках. «Затаварваньне» мае месца толькі таму, што дзялкі з Чарнігаўскай базы «Снабрэмонта» разышлі падзарабіць на запчастках, пра даючы іх МТС і саўгасам па цане, **якая ў чатыры разы перавышае дзяржаўную.** У рэзультаце гэтай махінацыі сарван плян рамонту трактараў МТС. 118 трактараў выведзены са строю і бязьдзейнічаюць з-за адсутнасьці запчастак.

Пралетарская дзяржава накіроўвае на вёску трактары, камбайны, малатарні і шматлікі парк машын для таго, каб яны там працавалі, для таго, каб яны там дапамагалі сабраць багаты ўраджай, для таго, каб яны ўмацоўвалі калгасны лад.

Мы ня можам і не павінны дапускаць ні малейшых перабояў у рабоце машына-трактарнага парку ў вёсцы. Кожная гадзіна прастою трактараў і машын з-за адсутнасьці запчастак—гэта зрыў дзяржаўнага пляну, гэта ўрон інтарэсам калгасаў, саўгасаў і, значыцца, усёй пралетарскай дзяржаве. Гаспадарнікі, якія дапускаюць невыкананьне плянаў выробу запчастак і несваячасова снабжаюць імі МТС і саўгасы, па справе робяць, як дэзарганізатары жалезнай пралетарскай дзяржаўнай дысцыпліны.

Трэба абвясьціць самую бязьлітасную барацьбу высокамерным настроям часткі гаспадарнікаў, якія разглядаюць заданьне па выробу запчастак, як нейкі «прымусовы асартымэнт», ад якога трэба пазбавіцца і які можна ня выконваць. Мы павінны забясьпечыць усе неабходныя ўмовы для таго, каб машына-трактарны парк мог працаваць бесьперабойна, з поўнай практнай магутнасьцю, без прастояў і страт каштоўнага рабочага часу як ва ўборачнай кампаніі, так і ў азімай сяўбе і ў зяблеве.

Сацыялістычнае зямляробства павінна даваць прыклады высокапрадукцыйнага выкарыстаньня машын. На прыкладзе ўзорнага прыстасаваньня машын мы павінны дэманстраваць усёй масе калгаснікаў і аднаасобнікаў вялізарныя пераваг буйной сацыялістычнай гаспадаркі, аспаваўшай па шырокім ужываньні машын. Практыкай узорнай работы машына-трактарнага парку мы павінны паказаць усім калгаснікам і аднаасобнікам, што азначаюць на справе славутыя **ленінскія** словы: перасесьці з мізэрнага мужыцкага коніка на каня буйной машыннай індустрыі.

Усім, хто сваёй дрэннай работай або нежаданьнем выконваць дзяржаўныя заданьні перашкаджае пасьпяховай рэалізацыі гэтай важнейшай задачы, павінен быць дан сакрушальны адпор. Машына-трактарны парк павінен працаваць **узорна.** «Правда».

У барацьбе за пралетарскі інтэрнацыяналізм

Наша партыя, няўхільна ажыцьцяўляючы нацыянальную палітыку **Леніна-Сталіна**, забясьпечыла магутны рост культуры беларускай культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместе.

Толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя, падрыхтаваная і праведзеная пад непасрэдным кіраўніцтвам авангарду рабочай клясы—партыі бальшавікоў, адкрыла найвялікшыя магчымасьці для росту і разьвіцьця беларускай нацыянальнай культуры, сацыялістычнай па сваім зьместе, для эканамічнага і культурнага ўздыму ўсіх нацыянальных меншасьцей.

Але нашы гістарычныя посьпехі на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва цельга разглядацьізаліравана ад агульнай справы барацьбы за перамогу пралетарскай дыктатуры ў краіне Саветаў.

Гэтыя посьпехі—вынік бранкай штодзённай дапамогі пралетараў усяго Савецкага Саюзу, і гэта дапамога ёсьць арганічнае зьвяно ленінскай нацыянальнай палітыкі нашай бальшавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК.

Партыя, ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку сустракае шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў. Недабітыя асколкі капіталістычных клясаў, рэшткі буржуазна-нацыяналістычнай контрэвалюцыі часта прыкрываюць сваю падрыўную контрэвалюцыйную дзейнасьць фальшыва-нацыянальнымі сьцягамі.

Партыя цьвёрда і няўхільна ажыцьцяўляючы пад кіраўніцтвам Сталіна вучэньне ленінізму, пасьлядоўна праводзіць барацьбу на два фронты—і супроць галоўнай небясьпекі—ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму і супроць мясцовага нацыяналізму. Ухіл да вялікадзяржаўнага шавінізму галоўная небясьпека.

Таму, што гэты ўхіл адлюстроўвае імкненьні клясава-варожых элемэнтаў і іх агентуры аднавіць прывілеі раней панаваўшай вялікарускай нацыі, вынішчэньня Кастрычніцкай рэвалюцыяй.

Вялікадзяржаўныя шавіністы ў сваёй барацьбе супроць пралетарскай рэвалюцыі, супроць нацыянальнай палітыкі Леніна-Сталіна прыбягаюць да розных мэтадаў і тактыкі. І ў першую чаргу вялікадзяржаўны шавінізм імкнецца «абыйсьці нацыянальную розьніцу мовы, культуры, быту» (Сталін).

Разам з тым партыя пястомна вядзе барацьбу супроць разгромленага, але яшчэ недабітага мясцовага нацыяналізму.

Беларускі нацыянал-дэмакратызм—ідэалёгія і практыка беларускай буржуазіі і кулацтва. Яго мэта—рэстаўрацыя капіталізму, яго стаўка—стаўка на інтэрвэнцыю, на ператварэньне нашай краіны ў калёнію замежнага імпэрыялізму.

Вораг, разгромлены, але яшчэ недабіты, цяпер прыбягае да новай тактыкі. Ад адкрытай прапаганды інтэрвэнцыі да замаскаванага шкодніцтва і на гаспадарчым і на культурным участках нашага будаўніцтва. Ад адкрытай барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту да тактыкі ціхай сапай, да завуаляванай падрыхтоўкі сваіх інтэрвэнцыянісцкіх плянаў.

Шкодніцтва беларускага контрэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму закранула ў тым ліку і такі участак, як мова, тэрміналёгія і правапіс. Беларускія нацдэмы сьвядома ўскладнялі і заблытвалі беларускі правапіс. Яны штучна насаджвалі беларускую мову, буржуазныя вульгарызмы, спрадвяковыя архізмы і палёнізмы, прабуючы стварыць бар'ер паміж мовай беларускіх працоўных мас і рускай мовай.

Ня цяжка ўбачыць, куды мецілі вораг. Мы маем яркія прыклады з ужо вядомых фактаў контрэвалюцыйнай дзейнасьці буржуазных украінскіх нацыяналістаў. Шпіёны Шумскія і да іх падобныя за акадэмічнымі спрэчкамі аб граматыцы захоўвалі сваю контрэвалюцыйную дзейнасьць, сваю верную службу інтэрвэнтам. Гэты новы манэўр ворага з сакрушальнай сілай выкрыў тав. **ПОСТЫШАЎ** у сваёй вядомай прамове на пленуме ЦК КП(б)У.

Тав. **ПОСТЫШАЎ**, выкрываючы памылкі кіраўніцтва Наркамасьветы УССР гаварыў:

«Хіба галоўнае шкодніцтва буржуазна-нацыяналістычных пятлюраўскіх элемэнтаў, якія заселі і нярэдка запраўлялі ў Наркамасьветы, толькі да таго і зводзілася, што яны няправільна расставілі літары «г» і «ґ»? І літары, зразумела, маюць значэньне. Але гэта-ж глупства параўнальна з тэй шкодніцкай работай, якая вялася ў сыстэме органаў асьветы і якая была накіравана на апутваньне нашай моладзі варожай пралетарыяту ідэалёгіяй. Раней чым расставіць літары «г» і «ґ», гэтыя шкоднікі з Наркамасьветы расставілі сваіх людзей на ўсёй сыстэме органаў Наркамасьветы».

Такія-ж факты мы мелі і ў нас у БССР, калі контрэвалюцыйныя беларускія нацдэмы, засеўшыя ў Акадэміі навук і ў органах Наркамасьветы пад шыльдай розных акадэмічных спрэчак актыўна праводзілі сваю контрэвалюцыйную дзейнасьць.

ЦК КП(б)Б на чале з т. **Гікало** пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі т. **Сталіна** з усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю ўскрыў цэлы рад фактаў контрэвалюцыйнай дзейнасьці недабітага клясавага ворага, намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па барацьбе за ленінскую нацпалітыку, за бальшавіцкі інтэрнацыяналізм.

Пастанова СНК БССР аб зьменах і спрашчэньні беларускага правапісу — важнейшы палітычны дакумант. Яна рашуча выганяе з беларускага правапісу нацыянал-дэмакратычныя ўплывы і скажэньні, яна значна палягчае шырокім працоўным масам вывучэньне беларускай пісьменнасьці, яна пад парадкуе беларускі правапіс задачам выхаваньня працоўных мас у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму.

Наша задача заключаецца ў тым, каб шырока растлумачыць у масах значэньне пастановы СНК БССР і ўзьняць іх на далейшае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі на далейшае вывучэньне беларускай пісьменнасьці, на барацьбу за далейшы ўздым беларускай нацыянальнай культуры, сацыялістычнай па сваім зьместе.

АБ ЗЬМЕНАХ І СПРАШЧЭНЬНІ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла вялізарныя магчымасьці для пасьпяховага разьвіцьця беларускай культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу. Беларуская мова з нагарджанай стала роўнапраўнай мовай у вялікім Савецкім саюзе, мовай пераважнага карыстаньня паміж дзяржаўнымі, прафэсыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі БССР, пры захаваньні поўнага роўнапраўя беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай моваў.

У выніку няўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, пры брацкай штодзённай дапамозе Савецкага саюзу працоўныя масы Беларускай Сацыялістычнай Савецкай рэспублікі пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Гэтыя посьпехі дасягнуты ў барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, які імкнецца **«абыйсьці нацыянальную розьніцу мовы, культуры, быту» (СТАЛІН)** і ў барацьбе з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

Беларускі нацыянал-дэмакратызм, выходзячы з сваіх буржуазных, контрэвалюцыйных мэт, праводзіў падрыўную, шкодніцкую работу як па гаспадарчым, так і на культурным фронце, у тым ліку і ў галіне мовы, тэрміналёгіі і правапісу. Нацыянал-дэмакратызм імкнуўся ўсімі мерамі і спосабамі адарваць беларускую літаратурную мову ад мовы шырокіх беларускіх працоўных мас, стварыць штучны бар'ер паміж беларускай і рускай мовамі і засьмечваў беларускую мову розным спрадвяковым архаізмамі і буржуазнымі вульгарызмамі.

Існуючы беларускі правапіс значна засьмечвае указанымі нацыянал-дэмакратычнымі плынямі і таму падлягае зьменам.

У мэтах рашучага выпраўленьня з беларускага правапісу нацыянал-дэмакратычных уплываў і скажэньняў, палягчэньня шырокім працоўным масам вывучэньня беларускай пісьменнасьці, аслабаненьня школы ад непрадукцыйнай работы пры вывучэньні беларускага правапісу, у мэтах далейшага разьвіцьця культуры беларускай мовы і поўнага падпарадкаваньня беларускага правапісу задачам выхаваньня працоўных мас у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе ўнесьці ў існуючы правапіс наступныя зьмены:

Правапіс галосных

1. Пісаць «я» замест «е» толькі ў першым складзе перад націскам (зямля, вядзе). Ва ўсіх іншых выпадках як перад націскам, так і пасьля націску, пісаць «е» (вялізарны, ваенізацыя, невысокі).

Гэтую зьмену не пашыраць на этымалёгічнае «я», якое застаецца нязьменным і ў ненаціскных складох, і на «я» у канчатку слоў (ярыла, памяць, рэвалюцыяй).

2. «Не» і «без», калі яны стаяць асобна, заўсёды пісаць праз «е».

3. Перад пачатковымі націскнымі галоснымі «о», «у» заўсёды пісаць «в», за выключэньнем геаграфічных назваў (восень, вучань, вобраз, але Орша, Ула). Перад ненаціскным «у» пісаць «в» тады, калі гэтае «у» не зьяўляецца прыставачным і не разьвілося з «в» (вучыцца, але: урад, улада, увага, участак, уезд).

Правапіс зычных

4. Выкінуць мяккі знак з напісаньня паміж мяккімі зычнымі, напрыклад, свет, снег, след, зняць, дзверы, цвёрды. Мяжкі знак захаваць перад мяккім зычным толькі ў тых словах, у якіх ён пішацца і перад цьвёрдым зычным (пісьмо, на пісьме і г. д.).

5. Таксама выкінуць мяккі знак паміж падоўжанымі зычнымі, напрыклад: (насенне, галлё, калоссе, жыццё, алё: лье).

Губныя зычныя і «р» не падоўжваюцца (давер'е, сям'я, б'ецца).

Падоўжанае «дз» перадаваць на пісьме праз «ддз» (суддзя, разводдзе).

6. У злучэньнях карэннага «д» з гукам «с» наступных суфіксаў вязьменна захаваць «с» (гарадскі, грамадскі).

7. Зычныя «г», «ж», «з», «х», «ш» у геаграфічных назвах ня зьліваць з суфіксальным «с», прычым «г», «к», «х» у большасьці выпадкаў зьмяняць на «ж», «ш» (Волжскі, Каўказскі, варонежскі, чэшскі, чуванскі).

У некаторых геаграфічных назвах «г», «к», «х» не зьмяняецца на «ш», «ж», «ц» (Выбаргскі, Цурыхскі, Узбекскі, Маздокскі).

У беларускіх словах «ж» і «ш» перад суфіксальным «с» ня пісаць: (можна, прыгоства, таварыства, хараство).

8. Для вызначэньня разьдзяльнага вымаўленьня зычнага з наступным галосным заўсёды пісаць апостраф: аб'ява, з'ява, суб'ект, кан'юнктура, Лавуаз'е). Выключэньнем з гэтага правіла зьяўляецца «л», пасьля якога пісаць мяккі знак: (Ільіч, Васільеў, рольеф, Мальер, ль).

Правапіс слоў іншамоўнага паходжаньня

9. Інтэрнацыянальныя рэвалюцыйныя словы не падпарадкоўваць агульнаму правілу аб аканьні. Пісаць: рэвалюцыя, совет, большэвік, комуна, соцыялізм, комунізм, Комінтэрн, пролетарый. У астатніх іншамоўных словах «о» пісаць праз «а», але захаваць «е» (э») (прафесар, маналог, тэлеграф).

10. Іншамоўнае «е» («э») пасьля зычных перадаваць праз «е», за выключэньнем выпадкаў пасьля «д» і «т», калі іншамоўнае «е» («э») перадаваць праз «э»: (методыка, геаграфія, педагог, этапея, эстафета, фанетыка, але — дэлегат, матэрыялізм, тэатр).

У даўно запазычаных словах «е» («э») перадаваць праз «а», «я» (гандаль, характар, літаратура, адрас, сак ратар).

11. Словы іншамоўнага паходжаньня з „і" („л"), як правіла, перадаваць на беларускім пісьме згодна традыцыйнага, пашыранага ў БССР вымаўленьня, г. зн. пераважна цьвёрда: метал, бензол, алмаз, вулкан, балкон, Алтай, Балтыка, Балканы, малекула, фабула, формула, аэраплан, бланк, клас, ланцэт, лафет, план, плагіят, платформа, праклямацыя, фланг, апладысменты, блок, глобус, дымлом, кілю, кілограм, калонія, лакамабіль, пілот, блуза, клуб, луна.

Але ў тых выпадках, калі ў жывой мове іншамоўнае „і" (л) вымаўляецца мяжка, пісаць — «ль» (мяжкае) —біноклль, аўтамабіль, мараль, стыль, вадэвіль, педаль, дэталь, альфа, альт, асфальт, астралябія, пляж, ляпсус, ляпіс, алюміній, ілюмінацыя, люк, ілюс, валюта, абсалютызм, люстра.

Пасьлядоўна мяккае «л» пісаць у злучэньнях: — «ляваць», «люцыя», «ляр», «лярны», «лятар», «льны»: фармуляваць, ізаляваць, рэволюцыя, эвалюцыя, перпендыкуляр, капілярны, палярны, рэгулятар, акумулятар, камплятар, актуальны, універсальны.

У іншамоўных словах пасьля «с», «з» заўсёды пісаць «і»: марксізм, сістэма, фізіка, універсітэт, але: музыка.

12. Іншамоўнае „th" (т), грэцкае „v" (фіта), перадаваць пераважна праз «ф»: арыфметыка, арфаграфія, лагарыфм, пафас, міф, Афіны, кафедра; але: тэатр, тэзіс, тэорыя, метад.

13. Іншамоўнае „f" (ф) грэцкае «і» (фі) ва ўсіх выпадках перадаваць «ф»: форма, фунт, фантазія, тыф, торф, фабрыка.

14. Злучэньне «тр», «др» у канцы слоў іншамоўнага паходжаньня перадаваць бяз зьмен: метр, літр, барометр, дыяметр.

15. Словы іншамоўнага паходжаньня, як **«пролетарый», «барый», «алюміній»**, якія раней пісаліся з канчаткамі «ы», «і», або зусім без канчаткаў, — пісаць з канчаткамі **«ый», «ій»** і скланяць як беларускія назоўнікі тыпу **«май»**.

16. Словы, як камуніст, сацыяліст, марксіст, пісаць без канчатку «ы» і скланяць не як прыметнікі (камуністага, камуністаму), а як назоўнікі тыпу **«брат»** — камуніст, камуністу.

Правапіс уласных імёнаў, прозьвішчаў і геаграфічных назваў.

17. Імёны іншых моў і геаграфічныя назвы пісаць з захаваньнем асаблівасьцяй той мовы, з якой яны ўзяты, але падпарадкаваць наступным правілам беларускага правапісу:

а) аб аканьні (з захаваньнем «э», «е»): Чэрнышэўскі, Шаўчэнка, Плеханаў, Жалезноў, Ноўгарад, Егор'евск;

б) аб напісаньні галосных пасьля зацьвярдзелых зычных: Чэлябінск, Жытомір, Чыстаполь, Чэрапавец;

в) аб дзеканьні і цэканьні, калі зычныя «д» і «т» зьяўляюцца мяккімі ў іншай мове (Дзержынскі, Владзівасток, Дзюрышг);

г) правілам аб пераходзе «в» ў «у» на канцы складаў: Молатаў, Варашылаў, Кіеў, Каўказ;

д) імёны іншых моў і геаграфічныя назвы не перакладаць як у поўным напісаньні, так і ў скарочаным, і пачатковае «о», «в», «т», «сч» перадаваць праз «о», «в», «т», «сч»: Іосіф Вісарыёнавіч Сталін, І. В. Сталін, Орджонікідзе, Терахаў, Владзікаўказ;

е) уласныя асобныя беларускія імёны пісаць паводле жаданьня іх носьбітаў: Васіль або Базыль,
Осіп або Язэп,
Іван або Янка,
Міхаіл, Міхал або Міхась.

МАРФАЛЁГІЯ.

18. Назоўнікі мужчынскага роду ў родным склоне адзіночнага ліку пісаць пераважна з канчаткамі «а», «я»: завода, цэха, трактара, інстытута, сацыялізма, універсітэта, правапіса, але: жалю, болю, гаю, лесу, краю, цементу.

19. Выключыць паралельныя формы «ом», «ох» у назоўніках мужчынскага і ніякага роду ў давальным і месным склонах множнага ліку: пісаць: кіраўнікам, аб кіраўніках, братам, аб братах, гарадам, аб гарадах, плячам, аб плячах.

20. Уніфікаваць залежныя склоны лічэбнікаў: два і дзве, абодва, абедзве; для ўсіх трох родаў пісаць: двух, абодвух; двум, абодвум, двума, абодвума; на двух, на абодвух.

21. Выключыць паралельныя формы дзеясловаў на **«яце», «іце»** першага спражэньня цяперашняга часу другой асобы множнага ліку, пісаць толькі: працуеце, чытаеце, ідзеце, вядзеце, нясеце.

22. Загадны лад дзеясловаў множнага ліку пісаць толькі: станьма, кінь ма, станьце, кіньце, бярыце, нясіце.

23. Увесьці ў беларускі правапіс дзеяпрыметнікі незалежнага стану, асабліва калі яны азначаюць сацыяльны стан, напрыклад: пануючы клас, а не пануючая клясa, ці клясa, якая пануе.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Беларускай Акадэміі Навук распрацаваць адпаведнае правіла ў новым правапісе.

24. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук тэрмінова ўпарадкаваць правілы беларускага правапісу на падставе гэтай пастановы і выдаць правапіс асобным выданьнем.

25. Усе ўрадавыя выданьні, пэрыядычныя газэты, часопісы і непэрыядычныя (навуковыя працы), зборнікі і г. д., усе дзяржаўныя дакументы і паперы на беларускай мове павінны з 15 верасьня 1933 году друкавацца згодна новага правапісу, прадугледжанага гэтай пастановай.

26. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы правесьці неабходныя мерапрыемствы і забясьпечыць перавод работы школ і культурна-асьветных устаноў на новы правапіс.

27. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук арганізаваць сыстэматычную навуковую работу па далейшым разьвіцьці і ўпарадкаваньні беларускага правапісу, усёй граматыкі і тэрміналёгіі, таксама арганізаваць новае выданьне беларуска-рускіх слоўнікаў, вытраўляючы з беларускай мовы ўсялякія буржуазна-нацыяналістычныя плыні і скажэньні.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісакаў БССР
С. КАНДЫБОВІЧ.

26 жніўня 1933 г.
г. Менск.

ЗА МЯЖОЙ

ПРЫЕЗД ЭРЫЁ Ў СССР

АДЭСА, 26. (БЕЛТА). Раніцой, 26-га жніўня, на параходзе «Чычэрын» прыбыў са Стамбулу ў Адэсу старшыня французкай радыкал-сацыялісцкай партыі, старшыня парляманцкай фракцыі гэтай партыі і старшыня камісіі па замежных справах французкай палаты дэпутатаў **Эдуард Эрыё.**

Эрыё суправаджаюць сэнатар **Сэрлен**, дэпутат **Жульен** і былы начальнік кабінету старшыні савету міністраў **Марсель Рэй.**

Да моманту прыбыцьця параходу на пристані сабраліся: старшыня адэскага абласнога выканаўчага камітэту т. **Пахомаў**, старшыня адэскага гарадзкога савету тав. **Чэбукін**, французкі дэпутат п. **Мэрган**, пам. заг. III заходняга аддзелу народнага камісарыяту замежных спраў тав. **Гельфанд**, дыплёматычны агент наркамату замежных спраў у Адэсе тав. **Гайлюнскі**, старшыня ВОКС Украіны тав. **Любчанка**, пам. старшыні украінскай замежнай гандлёвай палаты тав. **Вялічка**, капітан порту, прадстаўнік Саўгандальфлёту і прадстаўнікі другіх.

Вітаючыся з п. **Эрыё** і яго спадарожнікамі, тав. **Гельфанд** заявіў, што народны камісарыят на замежных справах даручыў яму вітаць п. Эрыё ад імя савецкага ўраду пры ўступленьні на савецкую тэрыторыю. Тав. Гельфанд адзначыў, што Эрыё і яго спадарожнікі зьяўляюцца пажаданымі гасьцямі ў Савецкім саюзе.

Вітаючы Эрыё ад імя працоўных Адэсы і вобласьці, старшыня адэскага аблвыканкому тав. **Пахомаў** сказаў: «Мы вітаем у вашай асобе чалавека, якога ведаем па яго пастаяннай барацьбе за мір».

Эдуард Эрыё прасіў тав. Гельфанда перадаць савецкаму ўраду ўдзячнасьць за прывітаньне. Зварачаючыся да тав. Пахомава Эрыё выказаў падзяку за прыём як ад свайго імя, так і ад імя сваіх прыяцеляў і прасіў перадаць гэту падзяку працоўным Адэсы і вобласьці.

Узмоцненая вярбоўка беспрацоўных нац-сацыялістаў у „аўстрыйскі легіён"

ВЕНА, 25. (Белта). У газэтах шмат трывожных паведамленьняў аб узмоцненых уцёках аўстрыйскіх нацыянал-сацыялістаў у Германію для ўступленьня ў «аўстрыйскія легіёны» у Ленгфэльдзе (Баварыя). Вярбоўка ў гэты легіён — на поўным ходзе. Уцёкі нацыянал-сацыялістаў у Баварыю, асабліва ўзмацніліся ў сувязі з прыходам у Германіі загадам, які абавязвае ўсіх беспрацоўных, якія належаць да аўстрыйскай нацыянал-сацыялісцкай партыі, пад пагрозай выключэньня, перапраўляцца ў Германію для ўступленьня ў «аўстрыйскі легіён».

Голад у польскіх вёсках

ВАРШАВА, 27. (Уласная інфармацыя «Зьвязды»). «ГАЗЭТА ВАРШАВСКА» піша, што з усіх бакоў Жывецкага павету надыходзяць весткі аб страшэннай нэндзы, якая панае сярод малазямельных рабочых. Рабочыя, якія працавалі ў капальнях у Верхняй Сілезіі, у прамысловай вярузе Бельско-Біла страцілі працу, за выключэньнем некаторых адзінак. Малазямельныя, якія маюць па 2-3 маргі зямлі, пры тым і тае непрацаваной пры вельмі нізкіх цэнах на прадукты сельскай гаспадаркі, ня ў стане пракарміць ня толькі сваю сям'ю, але нават і сябе.

Па вёсках Жывецкага павету бродзяць масамі дзеці і дарослыя на палавіну голыя, або ў лахманах, яным пазайздросьціць нават жабрак. Ёсьць сем'і, якія маюць толькі дзьве пары адзежы. Рэдка дзе ўжываюць цукар, соль і іншыя прадукты, якія трэба купляць у горадзе за грошы, якіх ніхто ня мае. Найбольшы голад і нэндза ў вёсках РАІЧЫ, МІЛЮЎКІ, ЦЫНІС, КАРБЕЛЕВА і ПРЫВОРАВА.

Японска-манчжурскія войскі акупавалі Гуюань

БЭЙПІН, 26. (Белта). Акупаваўшыя Далаюр японска-манчжурскія войскі заняілі **Гуюань** на поўдарозе паміж Далаюрам і Калганам.

Працоўная моладзь капіталістычных краін рыхтуецца да XIX МЮД'у

ПАРЫЖ, 26 (Белта). Камсамол Францыі актыўна рыхтуецца да сьвяткаваньня XIX МЮД'у. Агіткампанія зьвязаецца з падрыхтоўкай да сусьветнага антываеннага юнацкага кангрэсу 22-24 верасьня. Пасьля 25-тысячнага юнацкага мітынгу ў ГАРШЫ (недалёка ад Парыжу), камсамол з посьпехам правёў антываенныя мітынгі ў Руане і іншых гарадох. Звыш 50 тысяч маладых пралетараў і сялян, аб'яднаных у розныя палітычныя, прафэсыянальныя, спартыўныя і вучнёўскія арганізацыі, уключыліся ў антываенны і антыфашысцкі фронт кангрэсу.

Падрыхтоўка да МЮД'у вядзецца пад лёзунгамі: супроць імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР, супроць фашызму, за актыўную салідарнасьць з германскімі пралетарамі, супроць скарачэньня зарплаты і за паляпшэньне жыльлёвых умоў працоўнай моладзі, супроць прымусовай працы для беспрацоўных у канцлягерах і за павялічэньне дапамог па беспрацоўі.

* * *

ПРАГА, 23 (Белта). Чэхаславацкі камсамол разгарнуў шырокую масавую кампанію па падрыхтоўцы да XIX МЮД'у пад знакам барацьбы супроць атакі ўраду на дапамогі для соцень тысяч беспрацоўнай моладзі, супроць мілітарызацыі моладзі і ўвядзеньня працоўнай павіннасьці, якая падрыхтоўваецца ваеннымі колямі, а таксама пад знакам барацьбы за масы рабочай і сялянскай моладзі ў гарадох і вёсках.

* * *

СТАКГОЛЬМ, 25. (Белта). Орган кампартыі Даніі «Арбэйтэрблятэт» паведамляе, што на апошнім пасяджэньні цэнтральнага камітэту дацкай с.-д. лідэрамі сацыял-дэмакратычнага саюзу моладзі была ўнесена прапанова настойваць, перад урадам на забароне кампартыі

8-ы дзень Усебеларускай пераклічкі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю

АД ПОЛЯ І ДА ЗАГАТОЎЧАГА ПУНКТУ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА ЗА КОЖНЫ КІЛЁГРАМ ЗБОЖЖА

УСІМ НАЧАЛЬНІКАМ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ

За 15 дзён прайшоўшых са дня апублікавання ўказаньняў палітсэктару аб узмацненьні грамадзкай аховы ўраджаю, прыцягненьні калгасных дзяцей (піянэраў) да справы збору калосься, аховы ўраджаю, — у пасобных раёнах дзейнасьці МТС дасягнуты першыя рэзультаты, якія паказваюць, што калгасныя дзеці сваей работай прыносяць вялізарную карысьць, зьяўляюцца сілай у справе барацьбы за захаванасьць ураджаю.

У калгасе «Камінтэрн», Клімавіцкага раёну, арганізаваны атрад з 18 калгасных дзяцей сабраў 30 мяшкоў калосься. Прыклад у рабоце паказваюць Ануфрыева Маня — 12 год, Ануфрыеў Міша — 8 год. У калгасе «Карла Маркса» арганізаваны атрад з 10 чалавек, пад кіраўніцтвам піянэра Давыдава сабраў 5 мяхоў калосьсяў, прымае актыўны ўдзел у сушцы сена, ахове ўраджаю, у падрыхтоўцы ссыпных пунктаў.

У калгасе імя Пакроўскага, Дзяржынскага раёну, за некалькі дзён піянэрскі атрад сабраў калосься на плошчы ў 45 га, арганізаваў дзяжурствы з піянэраў па ахове палёў, у рэзультаце работы піянэраў 27 калгаснікаў абязьсцілі сябе ўдарнікамі.

У калгасе «Друць», Рагачоўскага раёну, школьнікамі сабрана 4 вазы калосься.

У раёне дзейнасьці Хойніцкай МТС 370 калгасных дзяцей прымаюць актыўны ўдзел у зборы калосься, ахове ўраджаю.

Але гэтыя прыклады пакуль што зьяўляюцца адзінкавымі. Работа па масавай арганізацыі калгасных дзяцей на справу збору калосься, аховы ўраджаю разгорнута невыстарчальна.

Прапаную:

1. У мэтах паляпшэньня работы правесьці па сельсаветах сходы калгасных дзяцей, з расказам аб дзецях, якія асабліва вызначыліся ў рабоце. Да 1 верасьня правесьці зьлёты калгасных дзяцей (піянэраў) раёну дзейнасьці МТС, з мэтай падвядзеньня першых вынікаў работы атрадаў піянэраў. На зьлётах правесьці прэміяваньні.

2. Строга сачыць за тым, каб работа калгасных дзяцей па зборы калосься і інш. улічвалася з боку калгасаў, усіляк заахвочвалася. Рэгулярна асьвятляць волыт работы ў палітаддзелаўскай, раённай газэтах і ў цэнтральным друку.

3. З прычыны невыстарчальнай увагі да падбору кіраўнікоў атрадаў сумесна з РК КСМ правесьці адбор кіраўнікоў з ліку лепшых камсамольцаў.

Палітсэктар падкрэсьлівае, што справа арганізацыі калгасных дзяцей (піянэраў) на справу барацьбы за якасьць работы ў калгасах (уборка палёў), ахова ўраджаю зусім не зьяўляецца справай кароткачасовай (да канца ўборкі збожжавых). Атрады неабходна пераключыць на кантроль і праверку ўборкі бульбы, агародніх культур, садоў (барацьба са стратамі), аховy сьвірнаў з насенным матар'ялам, страхфонду, с.-г. прыпад і г. д. Узрошы па ініцыятыве саміх калгасных дзяцей рух трэба дапамагчы камсамолу замацаваць, як адну з пастаянных форм работы вясковых атрадаў ІОП, маючую вялізарнае палітычнае значэньне ў справе выхаваньня ў дзецях сьвядомых адносін да грамадзкай сацыялістычнай уласнасьці.

НАЧ. ПАЛІТСЭКТАРУ МТС НКЗ БССР РАТНЭК.

ДЭЛЕГАЦЫЯ КАЛГАСАЎ АРШАНШЧЫНЫ У ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ

ВЯЗЬМА. (Наш. кар.). З Аршанскага раёну прыбыла дэлегацыя для праверкі дагавору сацыялістычнага спаборніцтва з Вяземскім раёнам Заходняй вобласьці. У склад дэлегацыі ўвайшлі прадстаўнікі палітаддзелу, райгазэты і ўдарнікі перадавых калгасаў.

Дэлегацыя наведала рад калгасаў, пабывала на палёх, азнаёмілася з ходам работ і якасьцю ўборкі. У калгасах заключаны дагаворы з прадстаўнікамі калгасу Аршанскага раёну.

Арганізавана абменная старонка ў райгазэце. Кіпер.

У пагоні за колькасьцю ігнаруецца якасьць

СЛУЦАК. (Ад нашага спэцкара). Яшчэ 30 ліпеня ў раённай газэце «Ленінскі шлях» была апублікавана пастанова бюро райкому КП(б)Б, у якой раён арыентуецца на выкананьне ў жніўні месяцы гадавога плану збожжаздачы.

Недарма ў сельсаветах раёну папярэднему ідзе пагоня за колькасьцю і ігнаруецца якасьць збожжаздачы. У апошнія дні на склады паступае недобраякасное збожжа. Жыта, ячмень і авёс прывозяць сырым, мокрым, засьмечаным. 21 жніўня калгасы Грэйскага сельсавету прывезьлі на склад 16 тон зялёнага і сырога жыта. 20 жніўня прывезьлі сырое жыта з вёскі Казловічы. Штодня вялікія колькасьці падвод адпраўляецца назад.

РК КП(б)Б, пастанавіўшы выкаляць гадавы плян збожжапаставак у жніўні, ня прыняў, аднак, неабходных мер, каб падрыхтаваць належную колькасьць складаў. Сёньня не хапае складаў на 400 тон.

Слуцкі РК КП(б)Б павінен неадкладна выправіць гэтыя грубыя памылкі, спыніць пагоню за «рэкордамі» і арганізаваць сапраўдную барацьбу за добраякасную ўборку і пастаўку збожжа бяз страт.

В. Стальноў.

Ударыць па антымэханізатарскіх тэндэнцыях

ШКЛОЎ. (Наш кар.). У раёне разгорнута масавая ўборка збожжавых культур і ільну. Асаблівую ролю на ўборцы ільну будуць адыгрываць ільнацерабілкі «Камсамолка», якімі прыдзецца вычерабіць 1400 га ільну. Але-ж з 65 ільнацерабілак Шклоўскай МТС вялікая частка яшчэ ня прывезена са складу. 23 церабілкі замест работы на калгасных палёх дагэтуль ляжаць грудай, паловэ з іх яшчэ нават не сабрана. Да 17-ці ня хапае перадкоў, і толькі зараз дырэктар МТС ЛЁКСІН надумаўся паслаць агента ў Магілеў, каб іх там атрымаць.

Да церабілак, якія прывезены на вытворчыя вучасткі МТС, не прыстасаваны зернаўпавіцелі.

Такія адносіны да церабілак тлумачацца тым, што ў МТС шмат хто скэптычна адносіцца да іх працы. Напрыклад, загадчык першага вучастку МТС тав. ГРЫЦКО з 17 церабілак вывез на вучастак толькі 6. Ён як мага адбрыкваецца ад церабілак, кажучы: «Мне іх няма куды падзець, у маіх калгасах рабочых рук хапае». На вучастак № 4 загадчык тав. ФІЛЬНАЎ з патрэбных 21 церабілкі вывез толькі 10.

Ня лепш справа з рамонтам малатарань. Ні адзін з загадчыкаў вучасткаў ня вывез малатарань на вучасткі і ніхто ў МТС пакуль што ня зьбіраецца выконваць асноўных дырэктыў партыі аб тым, што малацьба павінна ісьці пасьля жніва. Больш таго, у дагаворах, падпісаных МТС з калгасамі, як напрыклад з калгасам «Новы шлях», так і сказана, што абмалот ільну будзе да 25 верасьня г. г. Гэтыя тэрміны МТС вельмі расьцягнуты, невядома па якіх прычынах.

А. М.

Я. Макарэнка
СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ „КОЛАС", ХОЙНІЦКАГА РАЁНУ

УРАДЖАЙ АТРЫМАЛІ ВЫДАТНЫ

Мой калгас добра справіўся з веснавой сяўбой. Зямля была апрацавана як сьлед, з ужываньнем важнейшых правіл агратэхнікі. Таму і ўраджай у нас атрымаўся выдатны. Даўно такога ня бачылі. Жыта ў сярэднім сабралі па 13-14 цэнтнэраў з гэктара, мясцамі і па 20 цэнтн. Пшаніца ўрадзілася ў нас нябывалая, густая і дала 16,5 цэнтн. з гэктара. Нядрэнна і з іншымі культурамі.

Уборку збожжавых калгас закончыў своечасова. 107 га жыта ўбралі за 6 дзён. Усе збожжавыя ўбраны і засьцірваны. Брыгады змагаліся, каб ніводнага коласу не засталося на полі. Пасьля жніва два разы пусьцілі конныя граблі па полі. Каб яны лепш выбралі зуб'е перавязалі шпагатам. Па сьля грабель 90 калгасных дзяцей зьбіралі ўручную каласы, якія яшчэ засталіся. Спалы з поля вазілі ноччу, каб менш асьшалася.

З дзяржавай мы ўжо разьлічыліся поўнасьцю, выканалі гадавы плян збожжаздачы. На загатоўчы пункт здана 63 цэнтнэра жыта, 28 цэнтн. ячменю, 31 цэнтн. пшаніцы, 34 цэнтн. аўсу. Распляціліся і з МТС за работу.

Працадзень у гэтым годзе ў нас багаты—па 5,5 кілр. збожжавых на кожны працадзень. Многія нашы калгаснікі ўжо зараз становяцца заможнымі. Узяць вось удаву Заяц Адарку. Раней яна была бядняцкай, часта галадала, увесь час батрачыла. На сёньнішні дзень сям'я Заяц 6 працаздольных выпрацавала 677 працадзён. Да канца году яна будзе мець звыш тыся чы працадзён і атрымае 3850 кгр. жыта, 1100 кгр. ячменю, 600 кгр. пшаніцы і звыш 12.000 кгр. бульбы.

Або ўзяць ударніка Зайца Кузьму (два працаздольных). Ён атрымае 1855 кгр. жыта, 530 кгр. ячменю, 265 кгр. пшаніцы, 63 цэнтн. бульбы.

Калгаснікі добра ведаюць аплату і вагу працадня і таму з вялікай ахвотай ідуць на работу.

Зараз першая і другая брыгады калгасу разгарнулі сяўбу азімых. Гле ба пад азімыя (125 га жыта і 65 га пшаніцы) падрыхтавана. Сяўба праводзіцца выключна сялярками, каб у будучым годзе атрымаць лепшы ўраджай.

Такіх выпікаў мы дабіліся, дзякуючы дапамозе палітаддзелу МТС. Зусім іншым стаў калгас, зусім іншымі сталі людзі. На работу выходзяць досьвіта, кожная брыгада ведае сваё месца, мае сваіх коняй, інвэнтар. Людзі ня бегаюць з адной брыгады ў другую, не мітусяцца, як гэта было летась. Палітаддзел дапамог нам падабраць брыгадзіраў з лепшых калгаснікаў - ударнікаў, выпрацаваць вытворчы плян і правільна расставіць людзей.

Паміж брыгадамі як у часе сяўбы, так і ўборкі разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва. Наперадзе ідзе першая брыгада на чале з тав. Мінчыным. Усе збожжавыя першая брыгада ўбрала за 5½ дзён. Добра ў нас наладжан і ўлік працы. Ні адзін працадзень калгасніка не прападае.

Уключыўшыся ва ўсебеларускую пераклічку па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю, я выказваю ўпэўненасьць, што наш калгас справіцца з азімай сяўбой таксама добра, як справіўся з уборкай і збожжапастаўкай.

Чаму ў калгасе „Чырвоны араты" пагарджаюць якасьцю

СЯННО, 25. У некаторых калгасах раёну пагарджаюць пытаньнямі якасьці ўборкі і барацьбы са стратамі. Найбольш характарным прыкладам можа паслужыць калгас «Чырвоны араты» Пад'яжджаючы да калгасу, адразу кідаецца ў вочы вялікая колькасьць калосься, раскіданага на полі.

Вось вучастак ячменю ў 8 га. Без перапавялічаньня можна сказаць, што на гэтым вучастку можна было-б сабраць ня менш 30 пудоў добрага калосься.

На заўвагу, чаму не вядзецца барацьба са стратамі, старшыня калгасу Мурашка В. М. і брыгадзір Мурашка В. С. адказваюць: — што-ж, можна будзе і ў нас мабілізаваць дзяцей на збор калосься.

Можна будзе... А пакуль што каласы мокнуць пад дажджом.

Скошаны авёс на плошчы ў 27 га ў нязьвязаным відзе раскіданы па ўсім полі і ня ўбіраецца, псуецца пад дажджом.

— Лён мы ўбралі добра, — хваліцца брыгадзір Мурашка, але пры больш дэталёвым азнаямленьні з уборкай ільну выяўляецца, што лён вязалі бяз усякай сартыроўкі, у сноп і доўгія і кароткія сьцяблы, тоўстыя і тонкія. Шмат пустазельля.

У калгасе ёсьць зусім спраўная малатарня «Эддзі», але абмалот ільну чамусь-ці праводзіцца ўручную. Якасьць абмалоту дрэнная. У снапох пасьля абмалоту застаецца вялікая колькасьць галовак. Расьціл ільну таксама робіцца без папярэдняй сартыроўкі.

Збожжавая малатарня замест круглых сутак працуе толькі дзесяць гадзін. 24 жніўня малатарня зусім прастаяла ўвесь дзень, малацілі ўручную.

— Рукамі прывычней, — адказвае старшыня калгасу. Гэта ў той час, калі сяўба азімых тармозіцца з-за адсутнасьці выстарчальнай колькасьці насеньня.

Дзе прычыны таго, што ў «Чырвоным аратым» зусім не змагаюцца за якасьць уборкі. Лепшы адказ на гэта даюць самі калгаснікі Саўлевіч А., Мурашка Д. і іншыя.

— Мы ня ведаем, за што працуем. Амаль ні на адну работу ня вызначана норма, а калі і вызначана, дык нам аб гэтым нічога не казалі.

І сапраўды, на рад работ, як абмалот і далейшая перапрацоўка ільну, абмалот збожжавых і інш. нормы яшчэ ня вызначаны. Людзі працуюць і ня ведаюць, што яны атрымаюць.

Вось толькі хто ведае ацэнку сваёй работы — гэта старшыня калгасу, брыгадзір і рахункавод. Што ні дзень — акуратна яны налічваюць сабе па паўтара працадня.

Старшыня і рахункавод нават не патурбаваліся зрабіць папярэдні падлік таго, што атрымае кожны калгаснік на працадзень. За тое авансы ўжо разьмеркаваны па кулацкай ураўнілаўцы, а не па працадзнёх.

З працоўнай дысцыплінай у калгасе таксама дрэнна. Людзі выходзяць на работу, калі ім уздумаецца. Хто ў 7, а хто і ў 8-9 гадзін, а некаторыя зусім ня выходзяць на работу.

У раёне німала калгасаў, якія паказваюць сапраўдныя ўзоры барацьбы са стратамі. У калгасе «Паршні» з лепшых калгаснікаў-ударнікаў арганізавана інспэкцыя па якасьці і абмалоце. Пінэры калгасу штодня зьбіраюць каласы. Асаблівая ўвага ў калгасе зьвернута на якасьць уборкі ільну. У абавязковым парадку пры церабленьні, абмалоце і расьціле робіцца сартыроўка ільну.

У калгасе «Машчоны» інспэкцыя па якасьці таксама арганізавала дзяцей на збор калосься. 14 дзяцей за паўтара дня сабралі 2 з палавінай пуды калосься жыта і паўтара пуды калосься ячменю. У калгасе «3-ці рашаючы» 8-мі гадовы хлапец Гардзюк Аркадзі за няпоўны дзень сабраў пуд калосься жыта.

Справа толькі ў тым, што практыка перадавых калгасаў, якія дома змагаюцца за якасьць уборкі, не перанесена на ўсе іншыя калгасы раёну.

Брыгада «Зьвязды»: А. Зарубежны. і К. Кудзелька.

Кулацкая змова супроць чысткі пад маскай беднаты і актыву

Ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што клясавы вораг прабуе і будзе прабаваць скарыстаць чыстку ў сваіх інтарэсах. Толькі за апошні час выяўлен рад абураючых выпадкаў простай арганізаванай змовы клясавых ворагаў і перараджэнцаў супроць чысткі (шахта № 10-21 у Данбасе, завод Кардолента ў Маскве і г. д.).

Характарны выпадак арганізаванай кулацкай змовы выяўлен пры чыстцы магілеўскай партарганізацыі.

У часе чысткі ячэйкі КП(б)Б Княжыцкага сельсавету ў ячэйковую камісію па чыстцы паступіла калектыўная заява 18 аднаасобнікаў і 1 калгасніка. Падпісаўшыя заяву паведамляюць камісіі, што старшыня калгасу «Бальшавік», кандыдат партыі Пастаялкаў Мікалай зьяўляецца дэзэртырам Чырвонай арміі, удзельнікам начных грабяжоў, п'яніцай, былым дзякам, зросься з чужымі элемэнтамі, развалій калгас. Заява закончвалася запэўненьнем усіх падпісаўшыхся аднаасобнікаў, што калі камісія выключыць Пастаялкава з партыі, усе яны зараз-жа ўступяць у калгас. Заява падпісана: «Беднота і актыў», а таксама частка калгаснікаў». Далей сьледуе 19 подпісаў.

У часе парсанальнай чысткі т. Пастаялкава рад выступаўшых аднаасобнікаў пацьвярджалі ўказаныя абвінавачаньні.

Аднак, заслухаўшы тлумачэньне тав. Пастаялкава і высьветліўшы становішча ў калгасе «Бальшавік», ячэйковая камісія пад старшынствам тав. Станкевіча ня лічыла абвінавачаньняў, высунутых супроць т. Пастаялкава, даказанымі і перанесла пытаньне на ўзгадненьне з раённай камісіяй па чыстцы.

Раённая камісія з прыцягненьнем палітаддзелу МТС правяла падрабязнае расьсьледваньне фактаў, указаных у заяве, а таксама выявіла агульны стан калгасу «Бальшавік».

Што-ж выявіла расьсьледваньне?

Аказалася, што калгас «Бальшавік» зьяўляецца адным з лепшых калгасаў Княжыцкага сельсавету. У процівагу сельсавету і Магілеўскаму раёну ў цэлым, які ганебна праводзіў веснавую пасеўную кампанію, калгас «Бальшавік» скончыў сяўбу ва ўстаноўлены ўрадам тэрмін з перавыкананьнем пляну. Якасьць сяўбы — добрая, у рэзультаце чаго ўраджай у калгасе лепшы за іншых. У перыяд сяўбы калгас «Бальшавік» паслаў буксірную брыгаду для дапамогі бяднаму ў прарыве калгасу «Чырвоны баец». Праполка праведзена поўнасьцю і ва ўстаноўленыя тэрміны. Калгаснікі добра падрыхтаваліся да ўборачных работ і арганізавана праводзілі ўборку. Старшыня калгасу т. Пастаялкаў зьяўляецца ня дрэнным кіраўніком і карыстаецца аўтарытэтам у калгаснікаў.

У часе загатоўчай кампаніі мінулага году тав. Пастаялкаў моцна біўся за выкананьне пляну і выявіў не аднаго сабатажніка і зрыўшчыка загатовак. Данае ім заданьне т. Пастаялкаў выканаў поўнасьцю.

У той-жа час, будучы старшынёю калгасу, тав. Пастаялкаў дапусьціў рад памылак (неправільна рэгаваў на факты разбазарваньня і раскрадваньня калгаснай маемасьці, слаба паставіў масавую работу ў калгасе).

Аднак, гэтыя факты не даюць нікому права выстаўляць т. Пастаялкава, як злачынцу, чалавека клясавачужога, разваліўшага калгас, і прыпісваць яму няіснуючыя абвінавачаньні. Пры самым уважлівым расьсьледваньні выяўлена, што абвінавачаньні «19-ці» або зусім не адпавядаюць сапраўднасьці, або паданы ў памылёным скажоным выглядзе.

Так, абвінавачаньне ў дэзэртырстве з Чырвонай арміі аказалася неабгрунтаваным: тав. Пастаялкаў прадставіў камісіі дакументы, з якіх відаць, што ён з 1919 па 1923 г. бесьперапынна знаходзіўся ў радах Чырвонай арміі. Тав. Пастаялкаў ніколі ня быў дзякам, а будучы хлопчыкам-падросткам, яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі, сьпяваў у царкоўным хоры і з таго часу ніякіх адносін да царкоўнікаў ня мае.

Але хто-ж такія гэтыя 19 прадстаўнікоў «беднаты і актыву і чысткі калгаснікаў», якія рашылі выкарыстаць чыстку партыі для ўзьвядзеньня паклёпу на добрага бальшавіка, добрага кіраўніка калгасу т. Пастаялкава і ў чыіх інтарэсах яны дзейнічалі?

Ініцыятарам падачы паклёпніцкай заявы зьяўляецца аднаасобнік вёскі Залубінічча — Вансюкоў Васіль.

Вансюкоў раней меў заможную гаспадарку (15 га зямлі), двойчы ўваходзіў у калгас і двойчы выходзіў. Схаваў маемасьць свайго сваяка-кулака ад раскулачваньня і канфіскацыі, восенью 1932 г. самаўласна засеяў жыта на калгаснай зямлі. Вясною 1933 г. сузіўся за зрыў веснавой сяўбы (прадаў каня, а сам паехаў у Ленінград), быў арыштаваны. У Ленінградзе Вансюкоў заняўся спэкуляцыяй і быў адтуль высланы у сувязі з пашпартызацыяй.

Вось сацыяльны твар ініцыятара і аўтара «заявы».

Хто-ж астатнія ўдзельнікі кулацкай змовы супроць чысткі партыі?

Захарэнка Сымон — цьвёрдазаданьнік, Патапенка Хведар — брат высланага за развал калгасу, Сідарэнка Сымон і Сідарэнка Алесь — цьвёрдазаданьнікі, былі высланы за развал калгасу, Захарэнка Васіль — сын цьвёрдазаданьніка, Ліхуноў Ільля — моцны серадняк, ня выканаў заданьня па сяўбе, эгнаіў насеньне (сельгаспадатку плоціць 252 руб.), Ліхуноў Іван — таксама заможны (сельгаспадатак — 250 руб.).

А вось і «калгаснік» Асталенка... Яго родны дзядзька меў 60 га зямлі, брат за контр-рэвалюцыйную работу і развал калгасу асуджан і выслан у канцэнтрацыйны лягер. Жонка Патапенка «прынцыпова» на работу ў калгас ня выходзіць і ня мае ні аднаго працадня.

Далей ідуць сваякі пералічаных ініцыятараў і некалькі ашчуканых серадняковуў і беднякоў, галоўным чынам, якія вышлі з калгасу.

Вось «букет» клясавых ворагаў, якія рашылі ашукаць партыю, разваліць калгас і ў гэтых мэтах узьвесьці паклёп на кандыдата партыі, які выконваў даручаную яму партыяй работу.

Камісія па чыстцы выкрыла гэту кулацкую змову, гэты хітры манэўр недабітага клясавага ворага.

Раённая камісія па чыстцы пастанавіла лічыць кандыдата партыі тав. Пастаялкава правераным, адначасова ўказаўшы яму на неабходнасьць у будучым праяўляць большую пільнасьць і выправіць у сваёй практычнай рабоце тыя асобныя памылкі, якія ім былі дапушчаны.

Камісія дала палітычную ацэнку гэтай адкрытай кулацкай змове супроць чысткі, супроць лініі партыі па ўмацаваньні калгасаў і паставіла пытаньне перад палітаддзелам Магілеўскай МТС, у зону якой уваходзіць калгас «Бальшавік», аб неабходнасьці правесьці тэрміновую ачыстку калгасу ад чужых, клясава-варожых элемэнтаў і аказаць калгасу і яго старшыні тав. Пастаялкаву практычную дапамогу ў рабоце.

А. БАЛЦІН.
(Старшыня Магілеўскай райкамісіі па чыстцы КП(б)Б).

З фронту ўборкі, абмалоту і збожжапаставак
(Па тэлефону, тэлеграфу ад РК, палітаддзелаў, нашых кар. і БЕЛТА)

Лельчыцы

Калгас «Прагрэс», Гаманіцкага сельсавету, пад кіраўніцтвам палітаддзелу выпаў у рады перадавых. Сацыялістычным спаборніцтвам ахоплена кожная калгасная брыгада. Калгас дабіўся значных посьпехаў. Уборачная закончана. 15 жніўня плян збожжапаставак выкананы на 100 проц. Унесена 64 проц. натуральгаты МТС.

Калгас дасягнуў высокага ўраджаю — 9 цэнтнэраў жыта з гэктара і 10 цэнтн. ячменю. Прыступілі да ссыпкі насенных і страхавых фондаў і падліку даходаў.

Райгазэта — ШАТРУК.

Ельск

Калгас «Чырвоная зара», Багуціцкага сельсавету, шырока разгарнуў сацыялістычнае спаборніцтва. Брыгада Бэны Рыгора ўвесь час ідзе наперадзе; на ёй раўняюцца астатнія.

Калгас закончыў уборку азімых і яравых, за выключэньнем 12 га зялёнага аўса. Дабіліся ўраджаю ўтрая вышэйшага, чым летась. Гэктар жыта дае 11 цэнтнэраў, а ячменю — 18 цэнтн.

Даход калгаснікаў паялічваецца амаль у тры разы ў параўнаньні з мінулым годам. З 3 паловай кілёграмы збожжа атрымліваюць калгаснікі на кожны працадзень.

Калгас выканаў дзьве трэціх гадавога пляну паставак збожжа. 22 жніўня распачалі асеньнюю сяўбу, засялі 15 гэктараў.

Калектыўны карэспандэнт — ГАЗЭТА «БАЛЬШАВІЦКІ ЗМАГАР».

Барысаў

Друк ня раз сыгналізаваў аб дрэннай ахове ўраджаю на фэрме ЗРК «Камінтэрн».

Аднак, становішча з аховай па-ранейшаму не наладжана. 17-га жніўня на палёх фэрмы выкапана 30 пудоў бульбы, а 10 і 11 жніўня самі вартаўнікі Масьлянскі і Хведараў зрабілі пазражу.

НАВУМАЎ.

Уваравічы

Чыста ўбраны палі нашага калгасу «Чырвоны вострaў», Аньдзялінскага сельсавету. Усе азімыя і яравыя культуры ўбраны. На палёх не засталося ні аднаго коласу.

Пастаўкі жыта і крупяных культур выкананы. Кожны калгаснік у нас ведае, за што ён змагаецца. 6 кілё збожжа і 11 кгр. бульбы прыходзіцца на кожны працадзень.

Жаданьнем заваяваць пярэдняе месца ў гарэ нашы ўдарнікі-калгаснікі Шчэрбакова А., Сычова В., Чумакова Маня, Савачкін І., Гарцаў М. і Адачкоў Хведар.

Лодыраў Адаськова М., Барана І. і Калбасава Ам. мы занесьлі на чорную дошку, аштрафавалі кожнага на 5 працадзён, не далі авансу збожжа. Глядзіш, лодыры падцягнуліся.

Зараз усе сілы пераключылі на абмалот і асеньнюю сяўбу.

Старшыня калгасу МАНЕЕЎ.

Чашнікі

Саўгас «Вачавіцы» пад кіраўніцтвам палітаддзелу датэрмінова выканаў гадавы плян адачы збожжа. Здана 10 тон.

Затор на гомельскім элеватары

ГОМЕЛЬ.

На Гомельскім элеватары з выгрузкай збожжа, якое прыбыло рачным транспартам, стварылася пробка. Зрываецца перавозка збожжа з многіх паўднёвых раёнаў Беларусі. Каля элеватару стаяць нявыгружаныя 6 барж з 1.320 тонамі збожжа.

З месц паступаюць трывожныя сыгналы аб недахваце суднаў для пагрузкі збожжа, а судны стаяць нявыгружанымі каля гомельскага элеватару.

Віна ў стварэньні пробкі цалкам ляжыць на Гомельскім аддзяленьні Загатзбожжа і ў прыватнасьці на яго загадчыку Рыўкіне і загадчыку элеватару Крэнэры. Рыўкін і Крэнэр упарта ня хочуць выкананьць дырэктывы гарадзкой КК-РСІ аб адгрузцы збожжа вагонамі з элеватару ў пакгаўз.

Прадстаўнікі пагрузчана-разгрузчанай канторы рачнога транспарту што дзённа абіваюць парогі гомельскіх раённых партыйных арганізацый. Транспартная сэкцыя гарКК-РСІ проста ўхіляецца ад умяшаньня ў гэту справу. Патрабуем умяшаньня ЦКК РСІ і пракуратуры рэспублікі.

Бельскі і Модлін.

АБ РАБОЦЕ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БЕЛАРУСІ

(З выступленьня народнага камісара лёгкай прамысловасьці СССР тав. ЛЮБІМАВА на партнарадзе гаспадарнікаў лёгкай прамысловасьці БССР)

Работа лёгкай прамысловасьці, асабліва ў сёлетні год, мае вялізарнейшае значэньне. На лёгкую прамысловасьць ускладзена вялізарная задача—даць выстарчальную колькасьць прадукцыі, прадукцыі лепшай якасьці рабочым і калгаснікам.

Партыя і ўрад правялі за апошні год рад мерапрыемстваў па сельска-гаспадарчых пытаньнях, у рэзультаце якіх у гэтым годзе мы маем добры ўраджай збожжавых і гародніх культур. Сёлетні год пачнем стаць апошнім годам нашых труднасьцяў.

Ад нас, гаспадарнікаў лёгкай прамысловасьці, патрабавалася і патрабуецца, каб мы выкінулі вялізарную масу таварам, ва ўсіх вымаўляў ў тых разьмерах, у якіх запланавана, мы павінны непамерна паленьшыць іх якасьць, паставіць работу на больш высокую ступень, чым мы мелі да гэтага часу.

На лёгкую прамысловасьць на працягу апошняга часу зварачаецца асабліва шмат увагі. Тав. Сталін яшчэ на XVI зьезьдзе партыі паставіў пытаньне аб тым, што цяпер, калі мы ў асноўным выцягнулі цяжкую прамысловасьць, час ужо пачаць узяцца, — і мы маем усе магчымасьці для гэтага,— за высокаякасное ўзорыст лёгкай прамысловасьці.

На XVII партканфэрэнцыі, на зьезьдах і на сінежанскім пленумах ЦК ставіліся пытаньні лёгкай прамысловасьці і зайнялі значнае месца ў рабоце і ў пастановах нашых кіруючых арганізацый.

Ня гледзячы на ўсё гэта, разпучага крыку ў рабоце лёгкай прамысловасьці яшчэ няма. І адказнасьць за гэта ляжыць на ўсім кіруючым складзе, на ўсіх галінах лёгкай прамысловасьці.

На некаторых галінах за мінулае паўгодзьдзе бачучага году ёсьць пэўныя рэзультаты, пэўныя дасягненьні, але яшчэ недастарчальныя. Так, бавоўняная, трыкатажная і поўкавая галіны прамысловасьці выканалі плян першага паўгодзьдзя кала 100 проц. Але рад галін знаходзіцца ўсё яшчэ ў глыбокім прарыве. Швэйная прамысловасьць значна недавыконвае плян, гарбарна-абутковая таксама; ніяк ня выправяцца шкляна-фарфаравая і запалкавая прамысловасьці па ўсім Саюзе і на Беларусі ў прыватнасьці.

Мы выканалі праграму па Саюзе па ўсёй лёгкай прамысловасьці за паўгодзьдзе на 94,2 проц.»

Па Беларусі выкананьне праграмы выяўляецца ў яшчэ меншым процанце. На ўсёй прамысловасьці Беларусі — 85 проц., а па прамысловасьці мясцовай, за выключэньнем саюзных прадпрыемстваў — 84,3 проц. Такое становішча ў рабоце лёгкай прамысловасьці зьяўляецца зусім недапушчальным.

Усе добра ведаюць, што да Кастрычніцкай рэвалюцыі, да арганізацыі савецкай улады Беларусь зьяўлялася краем дробнага рамесьніцтва, дробнага саматужніцтва. За час-жа савецкай улады на Беларусі прамысловасьць створана заново, пабудаваны надзвычай добрыя памяшканьні — не халупы якія-небудзь, а проста палацы прамысловасьці, палацы працы. Возьмем такія прадпрыемствы, як фабрыка «КІМ» (трыкатажная) і «Сьцяг індустрыялізацыі» (швэйная) у Віцебску. Такімі прадпрыемствамі можа ганарыцца ўвесь наш Савецкі саюз. У нас мала такіх прадпрыемстваў, толькі ў Ленінградзе фабрыка «Красное знамя» можа крыху раўняцца з беларускай фабрыкай «КІМ».

Аднак, паглядзеце, як працуюць некаторыя галіны прамысловасьці. Вось тры асноўныя прамысловыя раёны Беларусі: Віцебскі, Менскі і Гомельскі. За паўгодзьдзе па Менску выканана 87,5 проц. пляну, па Віцебску — 77,3 проц., па Гомелі — 87,7 проц. Між тым, гэтыя прамысловыя цэнтры павінны даць за год вельмі вялікую колькасьць прадукцыі: па Віцебску — 120,600 тыс. руб., па Менску — 101,800 тыс. руб., па Гомелі — 26 млн. руб., па Магілеве — 24 млн. руб. і г. д.

Фактычнае выкананьне пляну цяпер ідзе ў меншым разьмеры, чым у мінулым годзе. Цяпер беларуская прамысловасьць выканала праграму ў разьмеры, прыблізна, 77,2 проц. ад мінулага году. У сумарных паказальніках у мінулым годзе прамысловасьць дала за 1-е паўгодзьдзе (у тых-жа цэнах) прадукцыі на 166,6 млн. руб., а ў першым паўгодзьдзі гэтага году — на 124 млн. руб. Памяншэньне на 23 проц., замест прыросту на 7 проц. на працягу году.

Такавы колькасныя даныя. Што-ж датычыць якасных паказальнікаў — як ідзе зьніжэньне сабекошту і выкананьне іншых якасных паказальнікаў, то даныя і тут паказваюць на дрэннае становішча.

Беларуская прамысловасьць павінна была даць за першы квартал 1,5 проц. зьніжэньня, за другі — 3,6 проц. зьніжэньня сабекошту, а фактычна дала ў першым квартале — плюс, павышэньне сабекошту на 5,27 проц., і за пяць месяцаў — плюс 4,57 проц.

Беларуская прамысловасьць за гэты час недадала дзяржаве прадукцыі на 23.600 руб. і панесла страты на 4-5 млн. руб.

Калі вы паглядзіце, як стаіць справа з прадукцыйнасьцю працы, то аказваецца, што выпрацоўка на аднаго рабочага выяўляецца, прыблізна, у 86 проц. ад першага паўгодзьдзя 1932 г., у той час, як сярэдняя месячная зарплата складае 108 проц.

Перавыдатак па фондзе заработку зьяўляецца за паўгодзьдзе ў 1.250 тыс. руб. Толькі па адным прадпрыемстве «Сьцяг індустрыялізацыі» перавыдатак па заработку складае 560 тыс. руб. і па фабрыцы «КІМ» — 160 тыс. руб.

Такавы якасныя паказальнікі работы. Паўстае пытаньне, чаму так дрэнна стаіць справа? Ці ёсьць у прамысловых прадпрыемствах належныя ўмовы для таго, каб яны працавалі, калі ня добра, то, прынамсі, здавальняюча?

Катэгарычна сьцьвярджаю, і ніхто ні на нарадах, ні ў гутарках па розных гарадох і прадпрыемствах па гэтым выступуць заявы, што ня было неабходных умоў для выкананьня праграмы на 100 процантаў.

Возьмем швэйную прамысловасьць. Уся сыравая база для швэйнай прамысловасьці — суконныя вырабы, бавоўняныя вырабы — усё знаходзіцца ў нашых руках, непасрэдна ў нас — у наркамаце лёгкай прамысловасьці. Калі прадпрыемствы не атрымалі гэтага сыраду, дык значыць яны ня ўмелі змагацца ў патрэбнай меры са яго атрыманьнем, або не змаглі своечасова выкуціць гэты сырэц, ня здолелі націснуць, як належыць, ня здолелі змагацца за сырэц.

На трыкатажнай прамысловасьці таксама ўвесь сырэц знаходзіцца ў нашых руках, частка сырцу ў руках галоўнага трыкатажнага кіраўніцтва. І не мавіць быць такога становішча, каб фабрыкі не забясьпечваліся сырцом, а калі яно і было, то пінаваты ў гэтым самі, гаспадарнікі.

Горш са скурсырцом, але і тут выкананьне праграмы на тым самым узроўні, на якім яно зараз знаходзіцца, ня можа быць апраўдана ніякімі прычынамі. Пры ўсіх недахватках у забясьпечэньні скурсырцом, усё-ж выкананьне праграмы непамерна ніжэй наяўных ресурсаў.

Усе мы ведаем, што ўмовы работы гэтага году куды лепшыя, як умовы мінулага году. Партыя і ўрад стварылі нам гэтыя лепшыя ўмовы. Досыць нагадаць дэкрэт ураду і пастанову ЦК аб барацьбе з прагульшчыкамі, пастанову, якая дала гаспадарнікам поўнае права па-гаспадарску падцягваць разьбіцьяеў, лодыраў, выганяць іх, стварыць сапраўдную вытворчую дысцыпліну. Пастанова ЦК аб прадуктовым забесьпячэньні рабочых, аб падп

Сваячасова і высокаякасна засеяць кожны гэктар азімых

БССР ПЕРАВЫКАНАЛА МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗБОЖЖАПАСТАУКАХ

ПАВОДЛЕ АПОШНІХ ДАНЫХ ПА РЭСПУБЛІЦЫ НА 25 ЖНІЎНЯ ЗАГАТОЎЛЕНА 64.455 ТОН ЗБОЖЖА. ГЭТА СКЛАДАЕ 122,6 ПРОЦ. ЖНІВЕНЬСКАГА ПЛЯНУ І 28 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАПАСТАВАК.

ЗА АПОШНЮЮ ПЯЦІДЗЕНКУ ПАСТУПІЛА 21.964 ТОНЫ ЗБОЖЖА. КАЛГАСЫ МТС ВЫКАНАЛІ ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН ПА ЦЬВЁРДЫХ ЗБОЖЖАПАСТАЎКАХ НА 191,1 ПРОЦ., А ГАДАВОЕ ЗАДАНЬНЕ НА 31,8 ПРОЦ. КАЛГАСЫ, ЯКІЯ НЕ АБСЛУГОЎВАЮЦЦА МТС, ВЫКАНАЛІ ЖНІВЕНЬСКІ ПЛЯН НА 224,5 ПРОЦ., А ГАДАВОЕ ЗАДАНЬНЕ НА 43,8 ПРОЦ. ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБНІКІ ЗДАЛІ 25.308 ТОН — 152,7 ПРОЦ. МЕСЯЧНАГА ПЛЯНУ АБО 25,7 ПРОЦ. ГАДАВОГА ЗАДАНЬНЯ.

САЎГАСЫ І КААПГАСЫ ВЫКАНАЛІ МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗДАЧЫ НА 78,6 ПРОЦ., А ГАДАВОЕ ЗАДАНЬНЕ НА 48,2 ПРОЦ.

ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА ПАСТУПАЕ НАТУРАПЛАТА ЗА ПАСЛУГІ МТС. МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 20,8 ПРОЦ.

ТРЭБА З УСЁЙ СІЛАЙ АДЗНАЧЫЦЬ ЗУСІМ СЛАБЫ ХОД ЗБОЖЖАЗДАЧЫ ПА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРКАХ. КУЛАКІ ЗДАЛІ ЎСЯГО 505 ТОН, ШТО СКЛАДАЕ ТОЛЬКІ 5,9 ПРОЦ. МЕСЯЧНАГА ПЛЯНУ. ТРЭБА РАШУЧА ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКІ САБАТАЖ (БЕЛТА).

ВАРАШЫЛАЎЦЫ ЗАВЯРШАЮЦЬ СЯЎБУ

КРЫЧАЎ, 26.

Калгасьнікі с.-г. арцелі імя Варашылава завяршаюць сяўбу азімай пшаніцы і жыта. **ДА 24 ЖНІЎНЯ ЗАСЕЯНА 62 ГА—92 ПРОЦ. ПЛЯНУ СЯЎБЫ АЗІМЫХ.**

Сяўба праводзіцца па добраапрацаванай і ўмоцнай глебе выключна ачышчаным насеньнем. **ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ КАЛГАСНАЙ ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ СТВОРАНЫ ГРАМАДЗКІЯ КАМІСІІ ПА ПРАВЕРЦЫ ЯКАСЬЦІ СЯЎБЫ, ЯКІЯ ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ.**

***

КЛІМАВІЧЫ, 26.

Калгасы «Прагрэс» і «Бальшавік» разгортваюць сяўбу азімых. За першыя дні сяўбы засеяна 22 га.

***

ЖЛОБІН, 26.

Калгас «Усход» першым у раёне разгарнуў сяўбу азімых. Засеяна 22 га азімага жыта і пшаніцы. Упяршыню гэты калгас засявае азімую пшаніцу, для якой адведзена найлепшая глеба.

РАЗЬБІЦЬ АНТЫПШАНІЧНЫЯ НАСТРОІ

БАБРУЙСК, 27. (Ад нашага карэспандэнта).

У цэлым раёне калгасаў раёну сяўба азімых настаўлена **ПАД УДАР.**

Характэрнейшай ілюстрацыяй можа служыць калгас **«ПЕРАМОЖЦА»**, Сычкоўскага сельсавету.

Праўленьне калгасу апынулася ў палоне кулацкіх антышпанічных настрояў. Яно і ня думае засяваць 4 га азімай пшаніцы (пасеўнае заданьне для калгасу).

Замест мабілізацыі насенных рэсурсаў і міжкалгаснага абмену старшыня калгасу «Пераможца» Ладзік паддаўся кулацкім настроям:

— У нас ня хопіць насеньня, — вось адзінае, што можна пачуць ад Ладзіка.

Аб злачынным бязьдзейнасьці праўленьня ленты за ўсё сьведчыць наступны факт. Да 25 жніўня праўленьне нават не абмеркавала пасеўнага плану па азімых.

Што-ж гаварыць аб практычных выніках. Ні адзін гэктар занятых папараў **НЯ ЎЗОРАН.** На іх яшчэ знаходзяцца яравыя культуры. Ні адзін гэктар чыстых папараў **НЯ ЎГНОЕН.** Насеньне і інвэнтар **НЕ ПАДРЫХТОВАН.**

Аналёгічнае становішча і ў цэлым раёне іншых калгасаў, асабліва, па Броскім і Гарбацэвіцкім сельсаветах.

У Гарбацэвіцкім сельсавеце яшчэ ні адзін калгас не прыступіў да сяўбы азімай пшаніцы. Падрыхтоўка насеньня нават не пачыналася. Ні адзін калгас не прыступіў да абмену, ачысткі і праўручваньня насеньня.

Праўленьне калгасу **«ПРАЎДА»**, Броскага сельсавету, па-кулацку разважае, што «для сяўбы яшчэ хопіць часу». Адсюль і вынікі. У калгасе і па сёнешні дзень не засеялі ні аднаго гэктара. Насеньне і інвэнтар зусім не падрыхтаваны.

Усё гэта адбываецца на вачох раённых арганізацый, але яны ня прымаюць літаральна ніякіх мер.

Што-ж гаварыць аб практычных

СЯЎБА ПАСТАЎЛЕНА ПАД УДАР

РЭЧЫЦА, 27 (Ад нашага карэспандэнта).

Аднаасобнікі ў раёне фактычна яшчэ не прыступілі да масавай сяўбы азімых. Віна за такое становішча ляжыць на раённых арганізацыях і сельсаветах.

Нагадлівыя адносіны да працоўнага аднаасобніка—заўтрашняга калгасьніка, ігнараваньне аднаасобных гаспадарак даюць сябе рэзка адчуваць.

Для прыкладу ўкажам на Горвальскі сельсавет.

Тут яшчэ ні адзін аднаасобнік і па сёнешні дзень не атрымаў дакладнага пасеўнага плану. Аднаасобнікі яшчэ і цяпер ня ведаюць, дзе, на якіх зямельных вучастках і колькі яны павінны засеяць азімых.

Ня дзіва, што па аднаасобных гаспадарках ні адзін гэктар пад азімыя ня ўзоран і ня ўгноен. Сярод працоўных аднаасобнікаў не праводзіцца ніякай масава-палітычнай работы. Дзесяцідзёркі не арганізаваны.

Чаго варта хоць-бы тое, што мясцовая партыйная ячэйка ня ведае, ці давезены да працоўных аднаасобнікаў пасеўныя планы, ці не. Горвальскі сельсавет — не выключэньне. Такія-ж агідныя справы дапускаюцца і ў іншых сельсаветах.

Не даецца належнага адпору і кулацкім тэндэнцыям зацягнуць сяўбу азімых па калгасах.

Калгасы «Чырвоны Кастрычнік», «Ударнік», «Шлях да сацыялізму» і рад іншых с.-г. арцеляў даўно падрысталі глебу пад азімыя, а да сяўбы яшчэ не прыступілі. Праўленьні гэтых калгасаў адкладваюць сяўбу азімых, паслухаўшы кулака, які шалёна агітуе, што «сеяць яшчэ рана».

Праўленьне калгасу «Ландшафт», Дземяхоўскага сельсавету, адкрыта заяўляе, што ня прыступіць да сяўбы раней, чым ня будзе скончана ўся ўборка. І ў выніку на калгасных палёх яшчэ не зазран ні адзін гэктар.

Такія-ж настроі пануюць і ў калгасе «Дзесяцігодзьдзе БССР», Дуброўскага сельсавету. Калгас злачынна марудзіць з сяўбой. Пад азімыя трэба было ўжо даўно падрыхтаваць 150 гэктараў. Па сёнешні-ж дзень узорана толькі 15 га.

Раённую МТС сяўба захапіла зьнянацку. Трактарны парк аказаўся непадрыхтаваным. У выніку дрэннага рамонту трактары прастойваюць і ворыва злачынна зацягваецца.

Працадні за...наведваньне пасяджэньняў

Разбазарваньне працадзён — адзін з новых маневраў недабітага кулацкага ахвосьця. У цэлым радзе калгасаў БССР нормы выпрацоўкі наўмысна скарочаны на 50-70 проц., а працадні налічваюцца як за поўную норму.

Так, напрыклад, у калгасе «Чырвоны сьцяг», Кармянскага раёну, а таксама ў калгасе «Парыская камуна» дзённая норма на адну жнівярку ўстаноўлена толькі ў 2—2,5 га.

У калгасе «Завет Ільліча», Гарадоцкага раёну, дзённая норма на культыватар устаноўлена ў 0,75 га. У тры разы менш супроць нормы НКЗ БССР. У калгасе «Зара» гэтага-ж раёну нормы выпрацоўкі для ўборачных машын скарочаны на 50 проц.

Усё гэта вядзе да разбазарваньня працадзён, да ўзаконьваньня прагулаў і пагражае сваячасовай уборцы.

Але ёсьць факты і адваротнага парадку, калі найбольш важныя, адказныя работы адносяцца да груп з меншымі расцэнкамі.

Так, у калгасе «Чырвоны ўсход», Гарадоцкага раёну, работы па ворыве і баранаваньні аднесьлі да трэцяй групы з ацэнкай у адзін працадзень за дзённую норму выпрацоўкі. А баранаваньне павінна быць аднесена да 4-й групы, з ацэнкай у 1,25 працадня і ворыва — да пятай групы з ацэнкай у 1,50 працадня.

У выніку такой практыкі араты паляводчай брыгады Грышанаў выпрацаваў за 6 месяцаў толькі 148 працадзён, у той час, як вартаўнік Самусёнак выпрацаваў 207 працадзён.

У гэтым-жа калгасе налічваюць калгасныя працадні за розную грамадзкую работу. Кожнаму члену праўленьня і рэвізійнай камісіі, напрыклад, рэгулярна налічваецца па 2 працадні «за наведваньне пасяджэньняў».

Неабходна на-хаду і поўнасьцю выправіць гэтыя грубейшыя памылкі. (БЕЛТА).

ЯК СКАРЫСТАЦЬ МАЛАТАРНЮ

На барацьбу са стратамі пры малацьбе павінна быць зьвернута асаблівая ўвага, з тым, каб не дапусьціць недавымалату, драбленьня зернятак, а таксама адыходаў збожжа ў саломе.

Малацьбу трэба праводзіць на загадзя падрыхтаваных, добра ачышчаных і ўтрамбованых токах. Малатарню трэба ўстанаўляць на роўным месцы па ветэрпасу, бо пры няправільнай устаноўцы малатарні страты нямінучы. Калі адзін бок малатарні будзе вышэй другога, то зерне, мякіна і амецьбе будуць ісьці не па ўсёй паверхні рашот, а з аднаго боку і зерне будзе дрэнна аддзяляцца ад мякіны і амецьбы. Калі-ж пярэдняя частка малатарні будзе ўстаноўлена вышэй, чым задняя, ці наадварот, дык ворах яго або будзе затрымлівацца на грохаце і рашотах, або будзе вельмі хутка зьбягаць. У абодвух выпадках будуць страты зерня.

Перад абмалотам правяраецца правільнасьць устаноўкі асобных частак малатарні і ў часе абмалоту трэба пільна сачыць за тым, каб ня было драбленьня зерня, каб зерне не заставалася ў каласох нявымалачаным, каб яно ня ішло разам з саломай, а таксама ў мякіну і амецьбе.

Для поўнага вымалочваньня зерня дэка ўстанаўляецца ў залежнасьці ад абмалачваемага збожжа і канчаткова замацоўваецца ў такім палажэньні, калі самае нязначнае адсоўваньне не ад барабана ўжо выклікае недавымалат. У тым выпадку, калі пры малацьбе застаецца зерне ў коласе (недавымалат), неабходна прыблізіць дэку да барабана. Наадварот, пры драбленьні зерня дэку неабходна адсунуць ад барабана.

Дэка ўстанаўліваецца на адноўкавай адлегласьці ад барабана, ні ў якім разе не дапускаючы перакосу, які выклікае недавымалат і драбленьне зерня.

Чыстата абмалоту залежыць ва многім ад правільнай падачы снапоў у барабан. Падачу снапоў у барабан трэба пачынаць пасьля таго, як барабан разаўе неабходную колькасьць зваротаў. Падача павінна рабіцца роўнамерным пластом адноўкавай таўшчыні па ўсёй даўжыні барабана.

Для больш роўнамернай і бесперабойнай падачы снапоў на складаных малатарнях трэба ўстанаўліваць самападавацель.

Для чыстаты абмалоту барабан павінен даваць устаноўленую паказаную на самой малатарні колькасьць зваротаў, бо пры павялічэньні ці зьмяншэньні ліку зваротаў барабана будзе драбленьне або недавымалат зерня. Каб атрымаць неабходную колькасьць зваротаў барабана, трэба адрэгуляваць работу рухавіка (трактара ці лёкамабіля) і падцягнуць галоўны пас.

Пры зношваньні зуб'яў ці плянак яны замяняюцца новымі, бо інакш будзе недавымалат зерня.

Каб папярэдзіць адходы зерня ў салому, трэба асабліва дакладна ўстанавіць адбівальны фартух ці накіроўваючую пласьціну і праверыць напяжэньне паса з барабана на пкіў, а таксама праверыць правільнасьць падачы снапоў у барабан. Калі фартух будзе апушчан занадта ніска ці пласьціна будзе расстаўлена над большым, чым трэба, кутом, дык саломы ня будзе поўнасьцю перадавацца на саламатрас.

Каб папярэдзіць затраты зерня ад адходу яго ў амецьбе, трэба правільна ўстанавіць грохат і не дапускаць перагрузкі яго ворахам, а таксама праверыць правільнасьць падбору рашот другой веялкі і напяжэньне паса на шківе каленчатага вала грохату.

Пры няправільным падборы сіт другой веялкі і вялікай вэнтыляцыі—зерня з другой веялкі зноў падае на грохат і перагружае яго. У гэтым выпадку трэба правільна падабраць рашоты другой веялкі і паменшыць вэнтыляцыю.

Для папярэджаньня адходу зерня ў мякіну трэба правільна падабраць і ўстанавіць рашоты і адрэгуляваць вэнтыляцыю.

Мы не павінны дапусьціць ніякіх страт пры абмалоце! Зарука посьпеху —у правільным выкарыстаньні малатарань.

А. ЗАГАРЭЛЬСКІ.

ДА ЧАГО ПРЫВОДЗІЦЬ ІГНАРАВАНЬНЕ АДНААСОБНІКА

РАГАЧОЎ, 27. (БЕЛТА).

На 26 жніўня ў раёне засеяна толькі 127 га азімага жыта. Асабліва дрэн на падрыхтаваўся да сяўбы адзін з самых буйных калгасаў у раёне — калгас **«ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».** І на сёнешні дзень гэты калгас ня скончыў ворыва, на вывез ўгнаеньня на палі і не ачысьціў насеньня. Ня дзіва, што на 26 жніўня калгас «Інтэрнацыянал» засеяў толькі тры га азімага жыта.

Калгас «Рэвалюцыя» і да гэтага часу яшчэ не засеяў ні аднаго гэктара.

Асабліва трывожнае становішча з сяўбой азімай пшаніцы. У раёне яшчэ не засеялі ні аднаго гэктара. Такое становішча — вынік прыпярэчных, гніла-лібэральных адносін да кулацкіх антышпанічных настрояў.

Характэрны факт: райземаддзел да 26 жніўня ня даў калгасам, літаральна, ніякіх указаньняў аб практычным правядзеньні міжкалгаснага насеннага абмену.

Амаль усе аднаасобнікі Гадзілавіцкага, Сьвяцкага, Збароўскага, Станькаўскага і Дваронцкага сельсаветаў яшчэ не прыступілі да сяўбы азімых.

Працоўны аднаасобнік ігнаруецца. У Гадзілавіцкім сельсавеце і па сёнешні дзень не даведзены пасеўныя планы да аднаасобных гаспадарак. Аднаасобнікі ня ведаюць, дзе і колькі ім трэба засеяць азімых. Аналёгічныя факты наглядаюцца і ў іншых сельсаветах раёну.

Першыя-ж дні сяўбы сыгналізуюць аб ігнараваньні якасьці пасеўных работ. Ёсьць нямала фактаў, калі сяўба праводзіцца неадсартаваным, неачышчаным насеньнем.

УДАРНІЦА АЛЬХОВАЯ АТРЫМАЛА ЦЁЛКУ

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ АЖЫЦЬЦЁВІМ ПАСТАНОВУ СНК І ЦК АБ ДАПАМОЗЕ БЕСКАРОЎНЫМ КАЛГАСЬНІКАМ

„ТОЛЬКІ У КАЛГАСЕ СТАНУ ЗАМОЖНАЙ"

РЭЧЫЦА, 26.

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» прыступіў да практычнага выкананьня пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб дапамозе бескароўным калгасьнікам.

Лепшым ударніцам калгасу, былым бяднячкам т. т. Альховай і Ушаковай, якія ня маюць кароў, выданы цёлкі з растэрміноўкай плацяжу на адзін год.

— Толькі ў калгасе я стану заможнай. Збожжа цяпер маю даволі, а вось зараз далі цёлку, — заявіла ўдарніца Альховая.

Калгасьнікі Бабікаў і Шугай згадзіліся прадаць цёлак па канванцыйных цэнах для бескароўных калгасьнікаў.

***

РАГАЧОЎ, 26.

Калгасьнікі з вялікім уздымам сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб дапамозе бескароўным. У калгасах раёну разгортваецца актыўная прапрацоўка гэтай пастановы СНК і ЦК.

Калгасьнікі с.-г. арцелі «Чырвоная армія» практычна ажыцьцяўляюць пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б). Намечаны 20 лепшых ударнікаў калгасу, якія ня маюць кароў, для атрыманьня цёлак у першую чаргу.

Частка цёлак вылучаецца з МТС калгасу. Рэшта набываецца ў калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Праўленьне калгасу прыступіла да закупкі цёлак.

„ЗРОБІМ, КАБ НЯ БЫЛО БЕСКАРОЎНЫХ ГАСПАДАРАК"

Прачыталі мы на агульным сходзе пашага калгасу імя Будзённага (Гомельшчына) пастанову партыі і ўраду аб дапамозе бескароўным гаспадаркам. Калгасьнікі сустрэлі яе з вялікім задавальненьнем.

Вось ён шлях да заможнага жыцьця—заяўляюць яны.

У нашым калгасе 89 гаспадарак, 500 га ральлі і сенажацяй. 2 гады таму назад у калгасе амаль зусім ня было абагуленай жывёлы—толькі адна карова. За апошні час абагуленае стада павялічылася галоўным чынам за лік куплі цялят у калгасьнікаў. Зараз мы маем 8 шт. буйнай рагатай жывёлы і 26 шт. маладняка.

Пашыраючы калектыўнае стада, мы не забываем і аб калгасьніках. Амаль усе ў нас маюць па карове. З 89 гаспадарак у нас толькі 9 ня маюць кароў. Калгасьнікі разводзяць і дробную жывёлу — сьвіней, авечак, птушак. Зараз мы пастараемся, каб у нас ня было ніводнай гаспадаркі без кароў.

Нашы калгасьнікі, асабліва тыя, якія ў калгасе з першага дня яго арганізацыі, жывуць так, як ніколі ня жылі іх бацькі і прадзеды. Хлеба і бульбы хапае да навіны. Няма такога старога калгасьніка, які-б да апошняга часу не прадаваў дзяржаве на калгасным рынку бульбу, трэчку, ячмень. Многія з нас так сябе забясьпечылі ўдарнай работай на полі, што на касавіцу без каналка сала ня выходзяць.

У гэтым годзе ў нас ўраджай добры. Жыта сабралі па 14-15 цэнтн. з гэктару, ячменю—16 цэнтн., калгасьнікі пачалі працаваць на калектыўнай гаспадарцы так, як раней працавалі ў сябе дома, не шкадуючы сіл. Се нажаць на плошчы 178 гэктараў мы ўзралі да 1 жніўня, пасьля чаго ўсю рабочую сілу перакінулі на ўборку азімых і яравых. Толькі таму мы ў асноўным справіліся з уборкай. Дзяржаве мы ўжо здалі 115 цэнтн. збожжа са 129, якія з нас належаць.

Паводле папярэдніх падлікаў калгасьнік у сярэднім на адзін працадзень атрымае толькі аднаго жыта 3 кілёграмы і 400 гр. (у мінулым годзе 540 гр.), а бульбы 12 кілёграм (у мінулым годзе 9 кілёграм).

Зараз, калі мы падводзім вынікі пройдзенага шляху, мы павінны прызнаць, што толькі наша пралетарская дзяржава сапраўды ўважліва адносіцца да запатрабаваньняў калгаснага працоўнага сялянства.

Ад імя калгасьнікаў с.-г. арцелі імя Будзённага:

ВАСІЛЬЛЕЎ, ШУШАНАЎ, ШЫЦІКАЎ, ШВЗДАЎ, КРАЎЦОВА.

УДАРНІКАМ--У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

КЛІМАВІЧЫ, 26.

У калгасах раёну шырока абмяркоўваецца пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб дапамозе бескароўным калгасьнікам у набыцьці кароў. Аб гэтай пастанове калгасьнікі гутараць усюды і ў брыгадах, на жніве, на малацьбе, і па хатах.

На агульных сходах калгасаў «Чырвоны маяк» і «Ударнік», Судзілаўскага сельсавету, калгасьнікі абавязаліся ў самы бліжэйшы час забясьпечыць каровамі ўсе бескароўныя гаспадаркі. У калгасах ужо абмяркаваны кандыдатуры на атрыманьне цёлят у першую чаргу. Першымі атрымоўваюць цёляты лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі. (БЕЛТА).

З загаду № 6 паліткіраўніцтва НКШЗ

ад 25 жніўня 1933 г.

Згодна рашэньняў ЦК УсеКП(б) ад 10-VII і 21-VIII—1933 г., назначаюцца:

1. НАМЕСЬНІКАМІ НАЧАЛЬНІКАЎ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ ДАРОГ: Паўднёвай чыгункі тав. ВІТОЛ Ж. Я. (нам. нач. ПУЛЬВО, слухач курсаў марксізму-ленінізму); Закаўкаскай чыгункі т. БАКУЛІН А. В. (нам. заг. разьмер. аддзелу ЦК УсеКП(б); Омскай чыгункі тав. КРАЮШКІН В. С. (парторг М.-Курскай чыгункі); Туркестанска - Сібірскай тав. ГОЛЬЦАЎ П. Я. (парторг Паўднёва-ўсходняй чыг.); Мурманскай чыг. тав. СЬЦЯПАНАЎ Д. А. (сакратар Адэскага абкому); Заходняй чыг. тав. ЛАБАНАЎ С. Б. (адказны інструктар парторгу НКШЗ); Екацярынінскай чыгункі тав. МАЛІЙ І. В. (парторг Паўднёвай чыг.).

2. НАМ. НАЧАЛЬНІКАЎ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ ЧЫГУНАК ПА КАМСАМОЛУ: Маскоўска-Курскай чыгункі тав. ВАРОБІН А. І. (сакратар ЦК ЛКСМ Украіны); Закаўкаскіх чыгунак тав. ФОКІН Н. А. (заг. сэктару Прафінтэрн); Мурманскай чыг. тав. НОВІКАЎ Н. П. (сакратар Ленінградзкага гаркому УсеЛКСМ); М.-Казанскай чыг. тав. АДАЕЎ І. Ф. (заг. транспартнага сэктару ЦК УсеЛКСМ); Екацярынінскай чыг. т. ЯРЦАЎ А. В. (сакратар абкому УсеЛКСМ ЦЧВ); Маск.-Бел.-Балт. чыг. тав. ТОПАЛЬ П. (заг. масавага творчага аддзелу ЦК ЛКСМ Укр.); Паўночнай чыг. тав. ПАЛЬМАЎ Ф. А. (заг. транспартнага сэктару ЦК УсеЛКСМ); Раз.-Уральскай чыгункі тав. ТАЛМАЧОЎ М. К. (прадстаўнік ЦК ЛКСМУ ў ЦКК-РСІ Укр.).

3. НАЧАЛЬНІКАМІ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ РАЁНАЎ І ПАМ. НАЧ. РАЁНАЎ ПА ПАЛІТРАБОЦЕ:

ПА ПАЎДНЁВАЙ ЧЫГУНЦЫ: Белгарадзкага раёну тав. ВОСТРЫКАЎ А. Я. (нач. катэдры гісторыі УсеКП(б) у ваенна-транспартнай акадэміі); Харкаўскага раёну тав. ЯРЫН М. Е. (парторг Паўночна-Каўкаскай чыгункі); Кр. - Ліманскага раёну тав. ТАРАН П. І. (парторг Заходняй чыгункі); Асноўскага раёну тав. РЫЎКІН І. Д. (парторг Мурманскай чыг.); Луганскага раёну тав. МКРТЧАН П. Г. (сакратар па транспарту ЦК КП(б) Арменіі).

ПА МАСКОЎСКА-КУРСКАЙ ЧЫГУНЦЫ: Маскоўскага раёну тав. САЛАЎЁЎ М. Д. (нам. кіраўніка групы ЦКК-РСІ); Горкаўскага раёну тав. ІВАНОЎ І. А. (сакратар па транспарту ЦК КП(б)Б); Арлоўскага раёну тав. ЧЭРАМУХІН Н. Е. (старшыня ЦК саюзу шофэраў).

ПА ТУР. - СІБІРСКАЙ ЧЫГУНЦЫ: Алма-Ацінскага раёну тав. ЗАЎЗАКОЎ Ф. Н. (спухач ІПІКП); Аўлів-Ацінскага раёну тав. ЛЕЎШЫН Н. Д. (член калегіі Наркампрацы РСФСР); Ангудзкага раёну тав. ЛЕБЕДЗЕЎ Т. Е. (член калегіі Наркампёгпраму СССР).

ПА ЗАХОДНЯЙ ЧЫГУНЦЫ: Бранскага раёну тав. АСІПОВІЧ В. З. (нам. нач. кадраў Наркам. замежнага гандлю); Гомельскага раёну тав. СЬМЕДЗЕ А. І. (сакратар Горкаўскага гаркому УсеКП(б); Жлобінскага раёну тав. БАЛКІН Е. П. (заг. аргінстру Амурскага абкому УсеКП(б); Канатопскага раёну т. ЯЛАЎ В. Н. (сакратар Краматорскага партыйнага камітэту).

ПА М.-КАЗАНСКАЙ ЧЫГУНЦЫ: Казлоўскага раёну тав. ПАНАСЕНКА Г. Т. (парторг Екацярынінскай чыгункі і сакратар па транспарту Днепрапятроўскага абкому); Казанскага раёну т. ФАЙНБЭРН Е. Л. (сакратар па транспарту ЦК АКП(б).

ПА ПАЎДНЁВА - ЗАХ. ЧЫГУНЦЫ: Чарнігаўскага раёну тав. КІСЯЛЕЎ І. А. (сакратар па транспарту Тат. абкому УсеКП(б); Кіеўскага раёну тав. КОКАРАЎ Н. Н. (нам. дырэктара партвыдату); Жмерынскага раёну тав. СЫРАМЯТНІКАЎ І. А. (парторг Бранскага раёну); Бобрынскага раёну тав. СОКАЛАЎ А. І. (сакратар па транспарту Заходняга абкому УсеКП(б); Грай-Варонскага раёну тав. КАМЕНСКІ І. М. (парторг Сам. Злат. чыг.); Адэскага раёну тав. ШЫРЫН А. П. (член калегіі Наркампрацы СССР).

ПА МАСК.-БЕЛАРУСКА-БАЛЬТ. ЧЫГУНЦЫ: Аршанскага раёну тав. КІРЫЛАЎ В. І. (парторг Віцебскага раёну); Ржэўскага раёну тав. КАЗЛОЎСКІ В. І. (нам. старшыні праўленьня Маскоўскага спажыўтаварыства); Вялікалуцкага раёну тав. ГУТКОЎ Л. Ф. (адказны інструктар парторгу НКШЗ).

ПА РАЗАНСКА-УРАЛЬСК. ЧЫГУНЦЫ: Астраханскага раёну тав. ШАПАВАЛАЎ С. І. (заг. транспартнага сэктару Паўночна - каўкаскага крайкому УсеКП(б); Сяратаўскага раёну тав. САІД-ГАЛІЕЎ С. Г. (член калегіі Наркампрацы СССР).

ПА ПАЎНОЧНА-КАЎКАСК. ЧЫГУНЦЫ: Каўкаскага раёну тав. АМІРХАНЯН Ш. (парторг Паўночнай чыг.); Туапейнскага раёну тав. КОГЗЕЎ Т. С. (слухач У. К. П.).

Начальнік паліткіраўніцтва і нам. наркома па палітчастцы

В. ПАЛОНСКІ.

стве можна было-б справу паставіць так, каб ня было і пылінкі, можна было-б завод трымаць у такой-жа чыстаце, як добрую лябараторыю.

Аб чым гаварыць гэтыя факты? Яны сьведчаць аб неразумеьні таго, як трэба будаваць прадпрыемствы, як разьмясьціць іх па-культурнаму, як культурна паставіць на прадпрыемстве работу, як культурна паставіць вытворчы працэс і як выробіць культурнага віду і добрую на якасьці прадукцыю.

Як стаіць справа з якасьцю прадукцыі? Гаварыць, што якасьць прадукцыі паляпшаецца на радзе прадпрыемстваў. Ёсьць спэцыяльны ліст гаспадарнікаў на імя сакратара ЦК Беларусі т. Гікало аб якасьці прадукцыі. Можна з задавальненьнем прачытаць гэты ліст. Гаспадарнікі клянуцца ў ім працаваць паіншаму, абяцаюць выпускаць лепшую па якасьці прадукцыю, апраўдаць даверэ партыі і г. д. Клятваў бывае даволі нават, але не заўсёды падобнага роду клятвы выконваюцца.

Якую гарантыю трэба стварыць і што арабіць, каб пастановы, якія мы прымаем, у прыватнасьці па якасьці прадукцыі, выконваліся? Гэта гарантыя ў добрым кіраўніцтве, у канкрэтным кіраўніцтве на прадпрыемстве і ў добрым кантролі за выкананьнем гэтых пастаноў.

Вельмі добрая рэзалюцыя работнікаў гарбарнай прамысловасьці аб тым, што ня будзе больш бракаробаў, што іх будуць выганяць, што гарбары дадуць продукцыю і лепшай якасьці і інш. Але калі мы прыяжджаем на прадпрыемства і пачынаем указваць на дэфэкты, на недапушчальную якасьць прадукцыі, дык людзі знаходзяць тысячы апраўданьняў.

Вось, напрыклад, у Гомелі выступаў сакратар парткалектыву абутковай фабрыкі і гаварыў, што ў іх да гэтага часу не закучыліся прымацоўваць гумовую падошву, што, кажа, нават з галоўнага кіраўніцтва адказалі, быццам яны ня ведаюць, як прымацоўваць гумовую падошву. Разам з гэтым сакратар сьцьвярджаў, што ў іх на фабрыцы дасканалая якасьць абутку. Калі-ж быў прынесен фабрычны абутак, ужо адсартаваны і запакаваны для адпраўкі, аказалася, што продукцыя нікуды ня вартая па якасьці.

На заводзе **«Бальшавік»** у Менску, які працаваў раней надрэнна, якасьць тавара зьнізілася.

На швэйнай прамысловасьці ў Гомелі, ня гледзячы на тое, што там адзін цэх — цэх бялізны — ужо закрывалі, работа ўсё-ж не палепшылася.

У барацьбе за якасьць прадукцыі мы абмяжоўваемся часта балбатнёй, прымаем добрыя рэзалюцыі і інш. Мы рашылі, што калі пасьля папярэджаньня аб дрэннай і ніпрымальнай якасьці прадукцыі тая або іншая фабрыка не папраўіцца, то мы будзе іх закрываць. Мы рабілі гэта ня раз з дзесяткам прадпрыемстваў па швэйнай, гарбарна-абутковай прамысловасьці, пачынаем укываць гэта ў адносінах да суконнай, трыкатажнай і бавоўнянай прамысловасьці. Інакш нельга, інакш барацьба за якасьць прадукцыі будзе балбатнёй. Людзі ва ўсіх прадпрыемствах балбочуць аб якасьці, а не змагаюцца з бракаробамі. **Гаспадарнікі павінны ведаць, якая фабрыка пастаўляе дрэнны тавар, павінны сыгналізаваць нам, ставіць пытаньне ў ЦК, пісаць у калектывы, якія вырабляюць дрэнны тавар, пісаць у газэты, падымаць грамадзкасьць.**

Праглядаючы сукно на менскай швэйнай фабрыцы, мы заўважылі натоўчаную аснову на 3-4 см. шырынёй. Пытаемся, якога прадпрыемства гэты матар'ял? Адказваюць: з Маскоўскай базы. А што такое Маскоўская база? Тамжа дзесяткі прадпрыемстваў. А канкрэтна, з якой фабрыкі — ня ведаюць. Тое-ж самае ў Віцебску. Паказваюць нікуды нявартую продукцыю, а з якой фабрыкі — ня ведаюць. Падобнае цяведаньне, з якой фабрыкі тавар, зьяўляецца не барацьбой за якасьць, а факецца не балбатнёй. Мы прымушаем зараз швэйнікаў прымацоўваць да кожнага ўзбраду фірму фабрыкі, каб ва ўсім Саюзе ведалі, якая фабрыка выпусьціла тавар. Мы прымушаем усе фабрыкі — суконныя, бавоўняныя і інш. выпускаць прадукцыю з указаньнем фірмы, каб усім было вядома, хто і які тавар выробляе.

Так стаіць справа з якасьцю прадукцыі. Калі гаспадарнікі далі сакратару ЦК абавязацельства, што больш ня будзе бракаробаў, то гэта ня ёсьць проста адпіска, гэта справа, якую трэба будзе бязумоўна правесьці, справа, якую неабходна будзе потым праверыць, як яе выканалі і за невыкананьне трэба будзе ўзграць.

Як нашы арганізацыі змагаюцца за сырэц, як арганізуюць загатоўкі сырцу? І гэта работа праводзіцца ня зусім задавальняюча. На буйным скурсырцу не дазагатоўлена за паўгодзьдзе 11 тыс. штук, па сьвіньнях 98 тыс., усяго недазагатоўлена 154 тыс. скур. Таксама вялізарнае недавыкананьне па збору ўцілсыравіны. Мы павінны клапаціцца ня толькі аб тым, каб была добра пастаўлена работа па загатоўках нашых арганізацый — Загатшэрсьць і Загатскур, але і па загатоўках, якія вядуцца іншымі арганізацыямі — кааперацыяй і інш.

У прыватнасьці, мы павінны змагацца за сырэц для тэкстыльнай прамысловасьці — тут, у Беларусі, за загатоўкі ільну. Мы летась вымушаны былі, з прычыны дрэннай першапачатковай апрацоўкі ільну пасласць на заводы брыгады. Заводы першапачатковай апрацоўкі ільну ня выконваюць сваёй праграмы, заводы закінуты, не рамонтуюцца. Мы на працягу гэтага году разаслалі сотні сьлесараў разам са спэцыялістамі-ільнішчыкамі, якія з інструментамі ў скрынях, на саначках абъездзілі па заводах першапачатковай апрацоўкі ільну, рабілі там рамонт, устаноўлялі тэхналёгічны працэс апрацоўкі ільну, арганізоўвалі самую апрацоўку. Паставілі работу прыблізна на 100 з лішнім заводах, у тым ліку і на радзе заводаў Беларусі. Цяпер мы вымушаны зноў мабілізаваць нашых работнікаў з ільняной прамысловасьці ў падзеле пасобных фурыцый, у кіраваньні паасобнымі часткамі работы. Так, мы мелі выпадкі, калі ў кіруючым органе фабрыкі іспавала каля 22-х асобных сэктароў, аддзелаў і пададдзелаў, была вялізарная колькасьць усякай адміністрацыі, загадчыкаў і намесьнікаў. На такой фабрыцы, як «Трохгорка» у Маскве, адны загадчыкаў і намесьнікаў было 135 чалавек, або 25 проц. ад усяго адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Наколькі складаней і грамоздкай была структура кіраўніцтва прадпрыем

У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

ТЭРОР СУПРОЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ

БЭРЛІН, 27. (Белта). У рэзультаце аблавы, у камунальных установах у БЭРЛІНЕ арыштавана 40 падазраваных у рашаўсюджаньні камуністычнай літаратуры сярод наведвальнікаў. У ДЭСАУ нібыта ўдалося ўстанавіць нааўнасьць камуністычнай арганізацыі ў 120 чалавек, большая частка, якіх арыштавана. У КІЛІ канфіскавана 20 парусных лодак па падазрэньні, што імі карысталіся для зносін з Даніяй, з мэтай дастаўкі нелегальнай літаратуры і перавозкі «падазроных».

Гамбург пад пагрозай краху

СТАКГОЛЬМ, 26. (Белта). Дацкая «Палітыкен» паведамляе, што на гамбургскай біржы адбылася нарада, на якой старшыня гамбургскай гандлёвай палаты Гэйба і бургамістр Крогман падкрэсьлівалі катастрафічнае эканамічнае становішча Гамбургу.

Паводле іх слоў, — Гамбург пад пагрозай краху. Крогман канстатаваў, што спрыяльная для буйных агрэгатаў палітыка ўраду «перашкаджае разьвіцьцю замежнага гандлю».

НОВАЯ АТАКА ФАШЫЗМУ СУПРОЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ

БЭРЛІН, 26. (БЕЛТА). Па ўсёй Германіі вядзецца ўзмоцненая барацьба супроць беспрацоўных, якія выконваюць выпадковую незарэгістраваную на біржы працы работу, а таксама супроць асоб з «падвойным заработкам», г. зн. супроць тых, у каго ў сям'і хто-небудзь мае заработак.

На афіцыяльных нарадах па барацьбе з беспрацоўем, у Бэрліне, Брандэнбургу і Грэнцмарку пастаноўлена звольніць 40 тыс. рабочых з «падвойным заработкам», замяніць жанчын і маладых рабочых рабочымі старэйшых узростаў, забараніць наём і звольніць незарэгістраваных беспрацоўных. ЛІК ТАКІХ АСОБ У БЭРЛІНЕ ДАСЯГАЕ 50 ТЫС. Далей мяркуецца ўвесьці ў Бэрліне спэцыяльныя пашпарты для рабочых з мэтай выцесьніць з вытворчасьці часовых рабочых, якія незарэгістраваны на біржах працы. Без гэтых пашпартоў рабочыя ня будуць прымацца на прадпрыемствы. Такія-ж меры праводзяцца ў Вэстфаліі.

Усе гэтыя меры выклікаюць сумненьні нават у буржуазным друку. Так, «ФРАНКФУРТЭР ЦЭЙТУНГ» указвае на адсутнасьць яснага вызначэньня, што трэба разумець пад «падвойным заработкам». «Хочуць, — піша газэта, — перашкодзіць прытоку «нявідочных» беспрацоўных у прадпрыемствы і звыш таго, хочуць пэўную частку зараз працуючых ператварыць у нявідочных беспрацоўных».

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗЬЕЗДУ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСЦКАЙ ПАРТЫІ

БЭРЛІН, 26. (БЕЛТА). У пачатку верасьня Ў НЮРАНБЭРГУ адбудзецца зьезд партыі нацыянал-сацыялістаў. У сувязі з падрыхтоўкай да зьезду прыезд у НЮРЭНБЭРГ будзе дапускацца толькі з асобнага дазволу. Забаронены таксама паветраныя палёты над Нюрэнбэргам на час пасяджэньня зьезду. Адбор удзельнікаў зьезду адбываецца з выключнай строгасьцю. Штурмавікі, якія будуць прымаць удзел у парадзе, што арганізуецца ў сувязі са зьездам, спэцыяльна адбіраюцца для гэтай мэты. Будуць дапушчаны толькі спэцыяльна праверэныя штурмавікі і члены «Сталёвага шлему». Усім астатнім штурмавікам і членам сталёвага шлему сурова забаронена прыяжджаць у Нюрэнбэрг у часе партыйнага зьезду.

З 1-га па 4-е верасьня забараняецца ўсякі прыезд у Нюрэнбэрг. На зьезьдзе будуць прысутнічаць кіраўнікі рэйхсвэру, ваеннага флёту, члены ўраду, вышэйшыя чыноўнікі. Будуць запрошаны члены дыпляматычнага корпусу. Запрошаны таксама прадстаўнікі фашысцкіх арганізацый з Італіі.

ЦІХААКІЯНСКАЯ ПАНАРАМА

Японска-амэрыканская барацьба ў правінцыі ФУЦЗЯН (знаходзіцца супроць японскай калёніі — вострава ФАРМОЗА) прымае ўсё больш востры характар.

Фотамантаж Вал. МЯДЗЬВЕДЗЕВА.

Аўстра-германскі канфлікт

ДОЛЬФУС АБАВЯЗВАЕЦЦА ПРОЦІДЗЕЙНІЧАЦЬ УСІМ СПРОБАМ АНШЛЮСУ

РЫМ, 26. (Белта). З добра інфармаваных колаў паведамляюць, што **Дольфус** у перагаворах з **Мусаліні** ўпяршыню фармальна абавязаўся процідзейнічаць як усім спробам «аншлюсу» так і ўсім дзеяньням, якія могуць аблягчыць магчымасьць «аншлюсу», (напрыклад, любой двухбаковай палітычнай згодзе з Германіяй).

З свайго боку Мусаліні абяцаў Аўстрыі ўсямерпае падтрыманьне. Гэтым абавязацельствам надана форма пратаколу. Імёны з гэтай мэтай у Рычмонд, дзе адбывалася сустрэча Дольфуса з Мусаліні, прыяжджаў таварыш міністра замежных спраў Італіі **Суліч.**

Дольфус узьняў таксама пытаньне аб узбраеньнях. Аўстрыя згодна мірных дагавораў мае права трымаць армію ў 30 тысяч чалавек, фактычна-ж трымае 22 тысячы войска і 18 тысяч хэймвэру. На гэтай падставе Дольфус дабіваўся згоды Францыі і Італіі ператварыць Хэймвэр у тэрытарыяльную міліцыю з гадовым тэрмінам службы, адначасова захаваўшы кадравую армію. Перадаюць, што Мусаліні прапанаваў Дольфусу абмежавацца давядзеньнем арміі да 30 тысяч чал.

* * *

ВЕНА, 26. (Белта). Паміж аўстрыйскім і венгерскім урадамі заключан ганлёвы дагавор, які прадугледжвае значнае павышэньне экспартных кантынгентаў для вывазу аўстрыйскага лесу ў Вэнгрыю і прадастаўленьне пераважальных мытных тарыфаў на ўвоз пшаніцы і мукі з Вэнгрыі ў Аўстрыю.

Канфэрэнцыі сацыял-фашыстаў

ПАРЫЖ, 26. (Белта). Учора закрылася канфэрэнцыя II інтэрнацыяналу. Прынятая 91 голасам супроць 16 «левых» рэзалюцыя носіць на сабе сьляды шматлікіх уступак і спроб змайстрыць відавочнасьць якогасьці «адзінства». Аднак, лідэрам сацыял-фашызму не ўдалося ўтаіць палітычнага разброду ўнутры II інтэрнацыяналу. Выступіўшы з матывіроўкай рэзалюцыі Баўэр вымушан быў прызнаць, што «разгалоссі паміж сэкцыямі ўнутры інтэрнацыяналу паставілі камісію па выпрацоўцы рэзалюцыі перад надзвычай складанай задачай». Рэзалюцыя зьмяшчае розьмэ розных думак і не дае ніякіх дыроктыў для партый Другога інтэрнацыяналу.

Сацыял-фашысцкія лідэры могуць спакойна разьяжджацца па дамох. У кожнага з іх па-ранейшаму рукі свабодны і адкрыты ўсе магчымасьці служыць «верай і праўдай» сваёй буржуазіі.

ВЫРАСТУЦЬ МАЛАДЫЯ МУЗЫЧНЫЯ КАДРЫ

Апошнімі днямі ў студыі Менскай радыёстанцыі выступілі два такія маладыя музычныя «чырвоныя спэцыялісты»—піяністка Саламэя Роэнблюм і дырыжэр Ісаак Гурэвіч. Абодва яны перш за ўсё—выхаванцы нашых савецкіх музычных установаў. Роэнблюм скончыла музычную школу ў Гомелі, а Гурэвіч—менскі музычны тэхнікум. Па сканчэньні гэтых навучальных установаў абодва маладыя артысты працягвалі музычную адукацыю ў маскоўскай кансэрваторыі, якую і скончылі пасьпяхова—Роэнблюм два гады таму назад (у праф. Астроўскай), а Гурэвіч—у гэтым годзе (у праф. Хайкіна).

Роэнблюм ужо цяпер (ёй усяго 20 год) можа быць названа ў поўным сэнсе слова закончанай піяністкай, але яе мастацкае выкананьне ясна паказвае, што яе музычныя даныя да канца яшчэ не разгарнуліся і пры належнай далейшай працы з яе вырасьце музычная сіла вельмі буйнога маштабу. Для гэтага Роэнблюм мае ўсё, што трэба. Яе ігра вызначаецца вялікай удумлівасьцю, разуменьнем намераў кампазытара і ўменьнем ажыцьцявіць гэтыя на меры. Яна ўмее рознастайніць сілу і характар гуку ад магутнага да пёгкіх, мяккіх, нейкіх паветраных тонаў. Гэта ёсьць музыкант высокае культуры. Пэдалізацыя яе бездакорная, чыстата і выразнасьць пасажаў з характарам «каскаду» гукаў—поўная. У канцэрце 11 жніўня Роэнблюм паказала глыбіню музычнага разуменьня ў санаце Шопэна, паэтычнасьць Шопэнаўскай рамантыкі ў яго ноктурне. Удалася ёй і буйная рэч Ліста--Пэшт скі карнавал (яго 9-я вэнгерская рапсодыя), але гэта рэч сама па сабе няўдзячная і ў параўнаньні з іншымі рапсодыямі Ліста мала цікавая нават па сваіх музычных тэмах. Затое ў сымфанічным канцэрце 13-га жніўня таленавітая артыстка проста зачаравала слухачоў сваім выкананьнем канцэрту Ліста. Канцэрт гэты вызначаецца характэрам музычнае тэкстыкі, на дзіва багатаю і грацыёзнаю распрацоўкаю як і вялікай рознастайнасьцю, у яной спалучаецца бляск віртоознасьці з глыбінёй і паэзіяй напеўнасьці. І ўсё гэта перадана было піяністкай дасканала. І калі пасьля сканчэньня канцэрту мікрафон быў выключан, артыстка была ўзнагароджана гарачымі воплескамі характэрам музычнае тэматыкі, на з боку ўсіх артыстаў аркестру.

Сымфанічную частку канцэрту 13-га жніўня правёў дырыжэр Гурэвіч. Пад яго кіраўніцтвам аркестр выканаў шэсьць нумароў з сюіт Грыга «Пээр Гінт» і аркестровы акампанімэнт да канцэрту Ліста. Гурэвіч быў пастаўлен у вельмі цяжкія ўмовы выкананьня—яму не магла быць дана рэпэтыцыя для сюіты Грыга і была толькі адна рэпэтыцыя для канцэрту Ліста. І тым ня меней малады дырыжэр справіўся са сваёй задачай цалкам добра. Быў і належны ўздым, была тонкасьць, рознастайнасьць, а часам і арыгінальнасьць ньюансіроўкі, было і разуменьне аркестрам мастацкіх задум дырыжэра. Але гэтыя задумы дырыжэра аркестру прыходзілася браць проста «з рукі», і экспромптнасьць, безрэпэтыцыйнасьць канцэрту дзе-ні-дзе—далі сябе адчуваць (клякса ў пачатку «Скоку Анітры», малая разгорнутасьць завірухі гномаў у апошнім нумары Сюіты Грыга). Найбольш удалым маладому артысту—дырыжэру «Мальва Грыд» з сюіты Грыга надзіва багаты і вельмі цяжкі аркестровы акампанімэнт да канцэрту Ліста.

Абодва маладыя савецкія артысты па казалі, што дзяржаўныя сродкі, затрачаныя на іхнюю адукацыю, затрачаны недарма. Застаецца пажадаць артыстам, каб і далей яны з посьпехам працавалі і з годнасьцю выконвалі абавязкі прад стаўнікоў савецкай пралетарскай музычнай культуры.

Ю. ДРЭЙЗІН.

Больш увагі хваёва-брыкетнаму апалу

25 чэрвеня гэтага году Саўнарком БССР пастанавіў арганізаваць у 5 раёнах рэспублікі: у Барысаўскім, Гомельскім, Быхаўскім, Рэчыцкім і Круп скім вытворчасьць хваёва-брыкетнага апалу і абавязаў беларускую кантору «Дрэўбрыкет» і саветы пералічаных раёнаў неадкладна разгарнуць самую энэргічную загатоўку хваёвага апалу, а менскі завод імя Варашылава — выпусьціць за пэрыяд ліпень—кастрычнік 14 брыкетных прэсаў.

З часу прыняцьця Саўнаркомам гэтай пастановы ўжо прайшло каля 2 месяцаў. Час зусім выстарчальны для таго, каб заданьне па загатоўцы хвоі было выканана. На справе-ж мы маем на сёнешні дзень такое становішча, што загатоўка толькі распачата і то ў адным толькі раёне — Барысаўскім, а ў іншых чатырох раёнах да загатоўкі яшчэ не прыступілі.

Лепшы, сухі пэрыяд часу для збору хвоі — чэрвень, ліпень і палова жніўня — ужо прапушчан і цяпер загатоўку прыдзецца весьці ў непарэўнальна горшых умовах восені.

13 жніўня ЦК КП(б)Б і Саўнарком БССР далі паступную разьвёрстку па загатоўцы хвоі на бягучы сэзон: Гомельскаму раёну — 6.500 тон хвоі, Церахаўскаму — 3.500 тон, Быхаўскаму — 4.000 тон, Барысаўскаму— 3.500 тон.

ЦК КП(б)Б і Саўнарком БССР у сваёй пастанове падкрэсьлілі вялізарнае народна - гаспадарчае значэньне хвойна-брыкетнай справы для БССР і ўсклалі на сакратароў райкомаў і старшынь райвыканкомаў поўную асабістую адказнасьць за ход выкананьня ўказанага заданьня па загатоўцы хвоі.

Заданьні раёнам ужо разасланы, грашовыя сродкі і харчовае снабжэньне адпушчаны ў выстарчальнай колькасьці, апараты на мясцох ужо створаны.

Час для загатоўкі хвоі, калі, ня трацячы ні аднаго дня, узяцца за справу з усёй бальшавіцкай энэргіяй, яшчэ не канчаткова ўпушчан, бо хвою можна загатаўляць да самай глыбокай восені і нават да выпадзеньня сьнегу. Разьмеры загатовак, даныя на 1933 год ЦК КП(б)Б і Саўнаркомам, вельмі нязначны і патрабуюць вельмі невялікай колькасьці рабсілы.

На сёнешні дзень у наяўнасьці ўсе аб'ектыўныя ўмовы для таго, каб заданьне ЦК КП(б)Б і Саўнаркому ня толькі было выканана, але і перавыкананa.

БССР чакае хваёва-брыкетнага апалу. Гэтая новая галіна прамысловасьці, якая мае ў БССР самыя шырокія пэрспэктывы для свайго разьвіцьця, павінна атрымаць у 1933 г. моцны пачатак.

РАВІКОВІЧ.

Радыё-пераклічка аб выкананьні фінпляну

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, Наркамфін і рэдакцыя газэты «Зьвязда» 2 верасьня г. г. а 24 гадзіне праводзяць радыё-пераклічку аб выкананьні фінансавага пляну 3-га кварталу і па абгаварэньні сацыялістычнага дагавору з Заходняй вобласьцю.

Ля мікрафону павінны прысутнічаць: СТАРШЫНІ РВК, ЗАГАДЧЫКІ АГІТМАСАВЫХ АДДЗЕЛАЎ РК КП(б)Б, САКРАТАРЫ РК ЛКСМБ, СТАРШЫНІ РАЙПРАФСАВЕТАЎ, ЗАГАДЧЫКІ РАЙФА І РАЙАШЧАДКАС, РЭДАКТАРЫ РАЁННЫХ ГАЗЭТ І УПАЎНАВАЖАНЫЯ НАРКАМФІНУ.

* * *

28 і 29 жніўня а 7 гадз. увечары ў клюбе мэдсанпрацы (Рэвалюцыйная, 2) адкрываецца шырокая гарадзкая нарада-канфэрэнцыя па санітарыі з удзелам прадстаўнікоў усіх санітарных установаў, санітарна-навуковых работнікаў, сэкцый аховы здароўя, камунальнай і жылпёвай Менгарсавету, усіх жактаў з абвесткай дня:

1. Значэньне і мэтады ачысткі гарадоў у справе іх аздараўленьня і спосабы гэтай ачысткі.
2. Пэрспэктывы разьвіцьця каналізацыі.

МЕНГАРСАВЕТ.

Дамо кнігу пра Менск!

У адным з нумароў «ЛИТЕРАТУРНОЙ ГАЗЕТЫ» ў чэрвені або ліпені была выдрукавана цэлая старонка пад агульнай «шапкай»: «Пролетарская Москва ждет своего художника». Работнікі кіно (С. ЭЙЗЕНШТЭЙН), замежныя пісьменьнікі (т. ДРАЙЗЭР, У. КАРМОН), старшыня МОСП тав. ДРОЖЖЫН выказаліся на яе шпальтах пра неабходнасьць найбольш поўнага, глыбокага і маляўнічага адлюстраваньня гіганцкага росту пралетарскай сталіцы ў мастацкай творчасьці. І шэраг савецкіх пісьменьнікаў РСФСР — В. ІНБЕР, ІВ. КАТАЕЎ, Д. КРАПЦЮКОЎ, А. АРХАНГЕЛЬСКІ, В. КАТАЕЎ, М. ЛЕВІДАЎ— уключыўся ў гэтую вялікую і адказную справу, узяўшыся за напісаньне адпаведных твораў.

Нам думаецца, што можна і неабходна правесьці пэўную аналёгію ў гэтым пытаньні са становішчам адлюстраваньня ў савецкай літаратуры БССР нашай сталіцы — Менску. Ці паказаны да гэтага часу чырвоны Менск у нашай літаратуры? Бязумоўна не. Мелькам, паасобнымі кадрамі, выглядае ён са старонак творчасьці асобных пісьменьнікаў — але такога паказу, які вымагаецца яго ростам на сёнешні дзень мы ня маем.

А між тым, для мастака слова Менск уяўляе сабой багацейшы матар'ял. Гэта горад, дзе адбыўся 1-шы зьезд РСДРП, дзе павешаны Іван Пуліхаў, дзе разыгрывалася трагедыя Курпоўскага расстрэлу, дзе гаспадарыў бізун нямецка і белапольскага акупанта,—і ў той-жа час гэта горад буйнейшых дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва — горад адзэй з пепшых у Саюзе бібліятэк, Унівэрсытэцкага гарадка, Акадэміі Навук, — горад «Камунара», заводу імя Варашылава, абутковай і швэйных фабрык. Паказаць шлях разьвіцьця гораду — ад губарнатарска-архірэйскага, захудалага правінцыяльнага асяродку да сталіцы прымежнай рэспублікі — якая багатая і ўдзячная задача!

Сацыялістычны Менск выхоўвае новага чалавека, перараджае старога, мяняе яго прывычкі, погляды, ідэалёгію цалкам. Безьліч тэм чакае пісьменьніка на тым-жа «Камунары», на тых-жа перадавых фабрыках нашай сталіцы.

Мы павінны неадкладна заняцца гэтым пытаньнем. Магчыва, варта было-б выдаць спэцыяльны альманах — «МЕНСК», прыцягнуўшы да яго афармленьня лепшых мастакоў. У кожным разе, над прыцягненьнем увагі пісьменьніцкай грамадзкасьці да тэматыкі Менску неабходна папрацаваць Аргкамітэту ССПБ, разам з гарпрафсаветам і адпаведнай сэкцыяй Менгарсавету.

КНІГА (КНІГІ) ПРА МЕНСК МОЖА І ПАВІННА БЫЦЬ НАПІСАНА!

Юр. ЛЯВОННЫ.

ПА БССР

Новы польскі нацыянальны сельсавет

Улічваючы пераважную большасьць польскага насельніцтва ў Сенажаткаўскім сельсавеце, Жлобінскага раёну, прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў:

Рэарганізаваць Сенажаткаўскі сельскі савет у нацыянальны польскі ў існуючых межах савету, за выключэньнем пасёлка Гарбачоўская Слабада і вёскі Гарбачоўская Слабада, якія далучаюцца да Казіміраўскага сельскага савету, Жлобінскага раёну.

Паляпшэньне жыльлёвых умоў пісьменьнікаў

ЦВК і СНК БССР пастанавілі прыраўняць членаў саюзу савецкіх пісьменьнікаў СССР у дачыненьні жыльлёвых правоў да навуковых работнікаў.

Жылая плошча, якая займаецца савецкімі пісьменьнікамі — членамі саюзу савецкіх пісьменьнікаў СССР, у выпадку яе аслабаненьня павінна перадавацца ў распараджэньне саюзу савецкіх пісьменьнікаў БССР для засяленьня яе пісьменьнікамі — членамі саюзу.

За ўдарную работу

Цэнтральная камісія садзейнічаньня дзяржкредыту і ашчадсправе пры Прэзыдыуме ЦВК БССР і калегія НКФ за ўдарную работу па мабілізацыі сродкаў прэміявалі рэдактароў Хойніцкай і Лепельскай раённых газэт, 11 старшынь калгасаў, 31 старшынь і членаў сельсветаў, 12 сакратароў партыйных і камсамольскіх ячэек, 17 работнікаў ашчадкас, 15 старшынь і членаў камсоладу, 7 рабочых і работніц і іншых.

Усяго прэміявана каля 100 чалавек на суму больш 9.000 руб (Белта).

Тав. Галенда — старшыня Дзяржпляну БССР

Тав. Галенда прызначан СНК старшынёю Дзяржпляну БССР і намесьнікам старшыні СНК.

Прызначэньне перадана на зацьвярджэньне ЦВК.

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б на 28-VIII-33 г. а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК, пакой № 34 склікае нараду дырэктароў навучальных устаноў і кіраўнікоў сэктароў кадраў наркаматаў па пытаньні пачатку новага навучальнага году.

Яўка абавязкова.

АДДЗЕЛ КАДРАЎ ЦК КП(б)Б

ХРОНІКА

* Да XIX МЮД'у ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна ў Менску арганізуецца кніжная выстаўка.

* Для дапамогі пэдагагічнымі кадрамі падпэфнаму БССР Бірабіджану НК асьветы БССР накіроўвае туды 5 настаўнікаў, скончыўшых Менскі яўрэйскі пэдтэхнікум, 2-х якія скончылі індустрыяльны пэдтэхнікум і 3-х кваліфікаваных настаўнікаў для школ другога канцэнтру.

* 3.070 чалавек будзе сёлета прынята ў сельска-гаспадарчыя ВНУ, тэхнікумы і рабфакі для падрыхтоўкі кадраў МТС, саўгасам і калгасам.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

З прычыны памылак, якія ёсьць у аб'яве тарыфаў за карыстаньне электраэнэргіяй, зьмешчанай у ліпені месяцы, ніжэй друкуюцца тарыфы з адпаведнымі папраўкамі:

ТАРЫФЫ

на электраэнэргію з 1-га ліпеня 1933 г.,

зацьверджаныя пастановай СНК БССР ад 25/VII 1933 г.

№ п. п.	ПЛАЦЕЛЬШЧЫКІ	Стары тарыф (За кілёватгадзіну) Р.	К.	Новы тарыф (За кілёватгадзіну) Р.	К.
1	Вулічнае асьвятленьне	—	08	—	12
2	Асьвятленьне кватэр працоўных, а таксама інш. памяшканьняў пры іх кватэрах і дваро ў	—	15	—	20
3	**БЮДЖЭТНЫЯ І ГРАМАДЗКІЯ УСТАНОВЫ:**				
	Дзяржаўныя, гаспадарчыя, кааперацыйныя і грамадзкія ўстановы і арганізацыі				
	Вучэбныя	—	30		
	Культурныя, лекавыя і дзіцячыя ўстановы	—	40		
	Рабочыя клюбы, тэатры, якія атрымліваюць датацыю па бюджэце, вакзалы, аптэкі сталовыя пры фабрыках і заводах, кааперацыйныя сталовыя і чайныя бяз продажу сьпіртавых напіткаў. Асьвятленьне лазьняў, пральняў, саматужных майстэрань	—	50	—	40
4	**АСЬВЯТЛЕНЬНЕ ДЗЯРЖРАЗРАХУНКОВЫХ УСТАНОЎ:**				
	Гасьцініц, мэблявых пакояў, цырульняў і інш. дзяржразрахункових устаноў, тэатры і кіно (за выключэньнем тых, якія атрымліваюць датацыю па бюджэце)	—	50	—	80
5	**АСЬВЯТЛЕНЬНЕ ГАНДЛЁВЫХ ПАМЯШКАНЬНЯЎ:**				
	Гандлёвыя памяшканьні, магазыны, гандлёвыя склады, рэстараны камэрцыйныя, сталовыя, кафэ, піўныя і г. д.	—	50	—	10
		—	70		
6	Ваенвед, асьвятленьне памяшканьняў ваеннага ведамства ДПУ і міліцыя	—	13	—	18
7	Асьвятленьне кватэр непрацоўнага элемэнту, памяшканьняў рэлігійнага культу і г. д.	1	00	3	00
	II.				
1	Маторная нагрузка прамысловых, саматужных і іншых прадпрыемстваў з магутнасьцю да 50 ква	—	25	—	20
2	Водаправод, каналізацыя, трамваі	—	12	—	18
3	Маторная нагрузка Ваенведа да 50 ква	—	25	—	18
4	Цагельныя заводы	—	05	—	15
5	Торфараспрацоўкі	—	—	—	10
6	Асьвятляльныя і сілавыя нагрузкі саўгасаў, калгасаў і МТС	—	—	—	15
	III.				
	Прадпрыемствы з магутнасьцю звыш 50 ква	—	16	—	13
	ЗА УСТАНОЎЛЕНУЮ МАГУТНАСЬЦЬ:				
	Ад 50 ква да 200 ква. за кожны ква. ў год				96
	200 » » 500 » » першыя 200 к. ў год				19200
	і за кожны аст. ква. » » па				84
	звыш 500 ква. за першыя 500 ква. » »				43250
	і за кожны астатні ква. » »				72

МЕНЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

ДЗЯРЖЦЫРК НОВАЯ ПРАГРАМА | ГАРАДЗКІ САД

Замежны атракцыён.

МОРСКІЯ ЛЬВЫ.

РОЗЕ ЛАСКА

—4 авторыльс—4 турысты. | Арноль акробаты.

Асатняя частка праграмы папаўняецца арыгінальнымі нумарамі рознага жанру.

ПАЧАТАК роўна ў 8 гадзін вечара.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"

Сёньня 28 жніўня і штодзенна замежны мастацкі фільм

„ВАНІНА"

драма у 6 частках

У гал. ролях Паўль Вэгенэр, Аста Нільсон, Бэрнард Гетцке, Паўль Лянге і Паўль Гартман.

Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. веч.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР АД 28 ЖНІЎНЯ ПРЫГОДНІЦКІ МАСТАЦКІ КІНО-ФІЛЬМ

„ДЗІЦЯ ДЗЯРЖЦЫРКУ"

У 6 ЧАСТКАХ.

Звыш праграмы гук. кіно-хроніка.

Пачатак а 2 гадз. дня

ГУКАВЫ кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" — Мастацкі гістарычны фільм ДЗЬЮЕ КАРАЛЕВЫ (Дароты Вернон) Трагедыя ў 10 частках).

Кіно „Інтэрнацыянал" — Замежны мастацкі фільм НАХАНЬНЕ ТАМАЗЫТЫ (цёмныя сілы) драма ў 8-мі частках.

Кіно СПАРТАК — замежны фільм НАВАЛЬНІЦА НАСУСТРАЧ (Тры паваленьні) Кіно-п'еса ў 8 частках.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

Кожны работнік літаратурна-мастацкага фронту, рабочы-ударнік, закліканы ўлітаратуру, пэдагог—выкладчык літаратуры, камсамольскі актывіст і студэнт

павінен чытаць і выпісваць дэкадную газэту

„ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА"

орган арганізац. камітэту Саюзу савецкіх пісьменьнікаў Галоўмастацтва БССР

Газэта „Літаратура і Мастацтва" — прапагандыст і арганізатар фронту, літаратуры, тэатру, музыкі, кіно вымуўленчага і самадзейнага мастацтва БССР.

Выходзіць тры разы ў месяц.

З прычыны абмежаванасьці тыражу газэты, Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі зьвяртае ўвагу работнікаў літаратуры і мастацтва, літаратурных, драматычных, музычных і вымуўленчых рабочых гурткоў на неабходнасьць здавець падпіску своечасова

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на верасень — 30 к. да канца году — 1р. 20 к.

Цана асобнага нумару 10 кап.

Патрабуйце газэту ва ўсіх кіёсках Саюздруку, на ўсіх чыгуначных станцыях.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: выключна праз лістанасецаў і паштовыя аддзяленьні і агенцтвы. Рэдакцыя газэты падпіскі ня прымае і падпісной платы ў рэдакцыю просьба не накіроўваць.

Адрас рэдакцыі газэты „ЛІМ—Менск „Савецкая, 63, Дом пісьменьніка.

Дзярж. Выд. Беларусі.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

паведамляе,

што ў мэтах лепшага абслугоўваньня сваіх абанэнтаў,

плацяжы за электраэнэргію будуць вытвараецца ў наступных пунктах:

Па вуліцы МОПР'а, д. № 64, канц. жанту № 30, з 1-га, 2-га і 3-га чысла кожнага месяца, з 1-й гадз. дня да 7 гадз. веч.

Па 1 Лекерта, д. № 1/19, канц. жанту № 16—з 1-га, 2-га і 3-га чысла кожнага месяца з 1-й гадз. дня да 7 гадз. веч.

Па Амбуляторнай вул. (б. Кляснай), № 15, канц. жанту № 25 з 4-га, 5-га і 6-га чысла кожнага м-ца, з 1-й гадз. дня да 7 гадз. веч.

Па Сураскай вул. д. № 6, канц., жанту № 60, з 4-га 5-га і 6-га чысла кожнага м-ца з 1-й гадз. дня да 7 гадз. веч.

У касе электрастанцыі, — Савецкая, 110, з 1-га да 5-га чысла ўключна, з 8 з пал. гадз. ран. да 6 гадз. веч. Акрамя таго, плацяжы можна ўтвараць праз ашчаджасу па безнаяўных разьлікох.

Пасьля паказаных тэрмінаў абанэнты, не ўплаціўшы за электраэнэргію, будуць **выключаны без папярэджаньня.**

Уключэньне вытвараецца па пакрыцьці запазычанасьці з пеняй і аплатай манцёра за ўключэньне.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ

даводзіць да ведама сваіх абанэнтаў, што згодна рашэньня прэзыдыуму Менскага гарсавету і пастановы № 1254 ад 17 жніўня 1933 г. Савету Народных Камісараў БССР, у мэтах забесьпячэньня своечасовага і поўнага разьліку абанэнтаў з электрастанцыяй,

УВОДЗІЦЦА СЫСТЭМА ЗАЛОГАЎ

у разьмеры сярэдняга коштумесячн. спажываньня электраэнэргіі

На падставе зазначанага ўсе абанэнты аплачваюць залогі згодна прадстаўленых абанэнтам электрастанцыяй рахункаў у вызначаныя ў іх тэрміны.

Грошы прымаюцца ў касе электрастанцыі (Савецкая, 110) выязнымі касамі ў часе іх работы на пунктах (сьпіс якіх абвешчаецца дадаткова) па безнаяўных разьліках і шляхах пералічэньня на к-рах № 10 электрастанцыі ў Белкамунбанку. У апошнім выпадку абанэнты абавязкова дасылаюць электрастанцыі адбітак даручэньня банку з адным экзэмплярам рахунку.

Пры пратэрміноўцы уплаты залогаў АБАНЭНТЫ ВЫКЛЮЧАЮЦЦА без папярэджаньня. Уключэньне робіцца пасьля ўнясеньня залогу з пеняй і выдаткамі за работу манцёра.

УВАГА: Плацяжы за штомесячнае скарыстаньне электраэнэргіі робяцца існуючым парадкам, незалежна ад залогаў.

ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ і зацікаўленых асоб, што Беларуская кантора УДА „Таргсін" ПЕРАЕХАЛА з Камсамольскай вул. 15 на **СУРАСКУЮ 10** — ў памяшканьне Мытніцы.

(Апошняя астаноўка трамваю № 1, супроць таварнай станцыі МББ).

Белкантора „Таргсін".

МЕНСКІ ЯЎРЭЙСКІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ТЭХНІКУМ

ў Курасошчыне, які, рыхтуе аграномаў, сярэдняй кваліфікацыі праводзіць

асеньні НАБОР

на базе сямігодкі на малочна-мыўёлагадоў і чае аддзяленьне ў ліку 60 асоб.

Прыём заяў прадоўжан да 8 верасьня, іспыты з 5 па 10 верасьня заняткі пачнуцца 10 верасьня.

Студэнты забесьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам, як і ў іншых індустрыяльных і с. гасп. тэхнікумах.

Адрас: Менск с. г. тэхнікум, тэл. 22-368.

Дырэкцыя.

Сьмілавіцкі дзяржаўны сельска-гаспадарчы тэхнікум кормаздабываньня (быўш. БРЖ), які рыхтуе аграномаў сярэдняй кваліфікацыі

праводзіць НОВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ

на першы курс у ліку 120 чал. на базе сямігодкі.

Прынятыя студэнты забесьпечваюцца інтэрнатам, пральняй, сталовай і стыпэндыяй па пасьпяховасьці. Тэрмін навучаньня—3 гады. Заявы прымаюцца да 1 верасьня на адрасе: п. в. Сьмілавічы, с. г. тэхнікум, прыймовай камісіі. Усіх залічаных будзе паведамляцца па указаным адрасе.

Да заявы неабходна дадаць наступныя дакументы: мэтрыку; пасьведчаньне аб адукацыі, аб здароўі, аб сацыяльнім паходжаньні, засьведчаную анкету, тры фотакарткі (засьведчаныя), для аднавасобнікаў—копію закладнога ліста, засьв. РВК, аб адносінах да вайсковай павінасьці (дамужчыны). Усе дакументы — ў арыгіналах.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ЗГУБЛЕНА

круглая ПЯЧАТКА

на імя калгасу „Абуджэньне" Вузлянскага с-с., Пухавіцкага р-ну,

ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНАЙ

ДА ВЕДАМА ДАКТАРОЎ і ЛЕКАВЫХ УСТАНОЎ „МАСАБЛХІМПРАМСАЮЗ"

Хіміка-фармацэўтычная фабрыка „ГАЛЕН-МАСКВА",

МАСКВА, 55—БАХМЕЦЕЎСКАЯ вул., 2-й ВЫШАСЛАЎЦАЎ, 6-а.

СЭКАР